ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 126 (4378)
ПАНЯДЗЕЛАК, 6 чэрвеня 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: — ПЕРАДАВЫ — Патокамі прамтавараў сустрэць разгортваньне калгаснага гандлю. — С. Гозман — Да гадавіны прамовы т. Сталіна прыйсьці з новымі перамогамі ў выкананьні шасьці ўмоў (2-я стар.). Ф. Гольдман — Вайсковай рабоце камсамолу — бальшавіцкія тэмпы і якасьць (3-я стар.).

Пра становішча разгортваньня калгаснага гандлю — пастанова ЦК КП(б)Б (3-я стар.). Аб разьвіцьці калгаснага гандлю — пастанова Калегіі НКЗ і Праўленьня Калгасцэнтру БССР (3-я стар.). Пра ход выкананьня веснавой сяўбы — пастанова Савету Народных Камісараў БССР (3 ст.).

Саўгасы БССР засеялі толькі 39,6 проц. пасеўнай плошчы. На аснове поўнага ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна заваяваць перамогу ў бліжэйшыя дні (1-я стар.).

Пазыкай 4-га заключнага ўзмацнім гаспадарчую магутнасьць і абароназдольнасьць Саюзу (1-я стар.).

Краіна сацыялізму павінна мець добрыя дарогі (2 стар.). «Закрашынскі мох» дабіўся поўнай выпрацоўкі сутачнага заданьня (2-я стар.).

Чаго варты мірныя запэўненьні японскіх імпэрыялістаў (4-я стар.).

Патокамі прамтавараў сустрэць разгортваньне калгаснага гандлю

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя ў сваіх рэзалюцыях адзначыла першаступеннае значэньне разгортваньня таваразвароту для забесьпячэньня бальшавіцкіх тэмпаў уздыму народнай гаспадаркі і для далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў працоўных мас.

Рост прадукцыі лёгкай прамысловасьці, сацыялістычная рэканструкцыя харчовай індустрыі, рост таварнай с.-г. прадукцыі калгасаў і саўгасаў ствараюць усе ўмовы для далейшага вялізарнага павялічэньня таварных фондаў.

З кожным годам узьнімаецца дабрабыт рабочай клясы і калгаснага сялянства, павялічваюцца іх запатрабаваньні на прадметы шырокага спажываньня.

Апошнія пастановы ЦК УсеКП(б), ЦВК і СНК Саюзу аб збожжа і жывёлазагатоўках, аб разгортваньні калгаснага гандлю зьяўляюцца важнейшымі мерапрыемствамі на шляху разьвіцьця таваразвароту, далейшага паляпшэньня снабжэньня рабочых і матар'яльнага дабрабыту працоўных мас.

Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі адказваюць на пастановы партыі і ўраду рашучым павялічэньнем прытоку с.-г. прадуктаў на гарадзкія рынкі. Разгортваецца калгасны гандаль—неадлучнае зьвяно савецкага гандлю. **Насустрач патоку сельгаспрадуктаў па вінен быць накіраван паток прамысловых тавараў.** Пашырэньне фондаў тавараў шырокага спажываньня—важнейшая, абавязковая ўмова далейшага ўзмацненьня калгаснага гандлю і савецкай фінансавай сыстэмы. **Кінуць у зварот дадатковыя таварныя масы, каб стымуляваць разьвіцьцё калгаснага гандлю—баявая задача дня.**

Лёгкая прамысловасьць павінна праявіць максымальную настойлівасьць і сапраўды баявыя тэмпы ў выкананьні прамфінпляну, у павялічэньні сваёй вытворчай праграмы. Лёгкая індустрыя БССР у першым квартале г. г. выпусьціла прадукцыі на 79 млн. руб., выканаўшы 87,9 проц. квартальнага заданьня. Прадпрыемствы лёгкай прамысловасьці недадалі краіне тавараў шырокага спажываньня на суму звыш 10 млн. руб.

Праграма другога кварталу прадугледжвае выраб тавараў на 95 млн. 514 тыс. руб.

Ажыцьцявіць гэту пашыраную праграму—справа гонару кожнага гаспадарніка, кожнай нізавой партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыі, кожнага рабочага-ўдарніка і ІТР.

Рэканструяваная харчовая індустрыя БССР павінна выпусьціць у гэтым годзе прадукцыі на 64 проц. больш, чым у мінулым. У 1931 годзе харчовая індустрыя недавыканала 25 проц. пляну, краіна не атрымала для патрэб рабочага спажываньня прадукцыі на 25 млн. руб. У гэтым годзе прадпрыемствы харчовай прамысловасьці павінны напружыць усе сілы, каб ні ў якім разе не дапусьціць далейшай запазычанасьці краіны.

Было-б зусім няправільным лічыць, што пашырэньне фондаў тавараў шырокага спажываньня—задача толькі лёгкай і харчовай прамысловасьці.

Аддаць максымум увагі павялічэньню таварных фондаў—адказны абавязак **цяжкай і лясной прамысловасьці.** Тут мы сустракаемся з выпадкамі барска-пагардлівых адносін да гэтай важнейшай справы, з апартуністычнымі разважаньнямі, быццам «цяжкая прамысловасьць мае сваю задачу—выраб сродкаў вытворчасьці, навошта ёй займацца зусім непадыходзячай работай—вырабам розных дробязяй».

Многія прадпрыемствы цяжкай індустрыі і лясной прамысловасьці не ўяўляюць сабе тых вялізарных магчымасьцяй, якія закладзены ў іх вытворчасьці ў галіне выробу прадметаў шырокага спажываньня. Возьмем, напрыклад, такі вучастак, як утылізацыя адкідаў мэталю. Досыць напомніць, што з тоны чыгуну каля 30-50 проц. ідзе на адкіды. Якія вялізарныя горы мэталю марна гінуць без карысьці для народнай гаспадаркі! Савецкі рынак адчувае вострую патрэбу ў такіх прадметах хатняга ўжытку, як вілкі, качэргі, трыножкі, малаткі, клямкі, завесы для дзьвярэй, самаварныя трубы, жароўні, падковы і інш. **Дзесяткі тысяч гэтых прадметаў могуць быць выраблены з тых тон мэталю, якія валяюцца на заводзкіх звалках.**

Калгаснікі і працоўныя-аднаасобнікі прад'яўляюць вялізарны попыт на гэтыя тавары. Задаволіць яго, кінуць на рынак дадатковыя таварныя рэсурсы—вось што павінны неадкладна зрабіць прадпрыемствы цяжкай прамысловасьці. Трэба толькі праявіць больш ініцыятывы, гібкасьці, разуменьня сучасных задач, пакончыць з пагардлівымі адносінамі да скарыстаньня «сьмецьця» заводзкіх звалак.

Народны Камісарыят цяжкай прамысловасьці прапанаваў усім сваім аб'яднаньням і прадпрыемствам ва што-б там ні стала дабіцца выпуску звыш праграмы прадметаў шырокага спажываньня на многа соцень млн. р. Белмэталяаб'яднаньне ў гэтым напрамку ўжо прыняло канкрэтныя меры: усім мэталяапрацоўчым заводам даны ўказаньні — выявіць адкіды мэталю і распрацаваць мэтады іх выкарыстаньня. **Арганізацыя уцільцэхаў і брыгад па пераапрацоўцы адкідаў — вось асноўны шлях да гэтага.**

Некаторыя заводы, як «Чырвоны мэталіст», «Камунар», «Чырвоны адраджэнец» ужо прыступілі да практычнай работы па вырабе раду прадметаў шырокага спажываньня.

Але трэба сказаць, што прадпрыемствы цяжкай прамысловасьці вельмі павольна наварочваюцца тварам да выкананьня дырэктыў партыі і ўраду.

Перамагчы кансэрватызм і коснасьць у гэтай справе — важнейшы абавязак арганізацый мэталяапрацоўчай прамысловасьці БССР.

Яны павінны зразумець, што задача заключаецца ў тым, каб умець злучыць задачы поўнага выкананьня асноўнай праграмы з інтарэсамі разгортваньня савецкага гандлю і ўзмацненьня грашовай сыстэмы.

Ня можа застацца ў баку ад гэтай справы і **дрэваапрацоўчая прамысловасьць Беларусі.** Яна можа і павінна даць звыш плянавых заданьняў тавараў шырокага спажываньня на мільёны рублёў.

Выраб іх дагэтуль займаў зусім нязначнае месца ў агульнай праграме дрэваапрацоўчай прамысловасьці. З агульнага гадавога пляну «Белдрэву» па выпуску валавой прадукцыі ў 60 млн. 585 тыс. руб. на долю прадметаў шырокага спажываньня прыпадала толькі 2 млн. 812 тыс., або 4,6 проц., прычым палова гэтай прадукцыі выраблялася па заказах розных трэстаў і аб'яднаньняў. Сотні тон лесаадкідаў прадаваліся на апал розным арганізацыям. Між тым, дрэваапрацоўчая прамысловасьць мае ўсе магчымасьці да максымальнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і пашырэньня выпуску прадметаў шырокага спажываньня: сталоў, табурэтак, вешалак, кухонных шафаў, дзіцячай мэблі, клетак для трусоў і інш. Кансэрватызм «Белдрэва» ў гэтай справе павінен быць зломлен.

Ператворым заводзкія звалкі ў крыніцу выробу дэфіцытных прамтавараў! Максымум сіл і сродкаў — на выкананьне гэтай адказнай задачы.

ЗАСЕЯЦЬ НЯ МЕНШ 184 ТЫС. ГА

САЎГАСЫ БССР ЗАСЕЯЛІ ТОЛЬКІ 39,6 проц. ПАСЕЎНАЙ ПЛОШЧЫ

НА АСНОВЕ ПОЎНАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ШАСЬЦІ УМОЎ т. СТАЛІНА ЗАВАЯВАЦЬ ПЕРАМОГУ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ

Саўгасы „Сьвінаводу" не змагаюцца за кармовую базу

Калі ў мінулым годзе на 1 чэрвеня саўгасы Сьвінаводу выканалі плян вес навой сяўбы на 39,5 проц., дык у гэтым годзе, ня гледзячы на больш ранні пачатак палявых работ, саўгасамі Сьвінаводу засеяна на 1 чэрвеня 24.733 га—**31,5 ПРОЦ. ЯРАВОГА КЛІНУ,** пры 52,9 проц. па рэспубліцы.

Маючы 6.000 рабочых коняй і 347 трактараў саўгасы пры правільнай арганізацыі працы і скарыстаньні цягавай сілы, **павінны былі засяваць штодзенна мінімум 4.500 га.** Між-тым, за апошнюю пяціднёўку ўсе саўгасы засеялі 7.748 га, за мінулыя пяць дзён засеяна 6.132 га.

Плян сяўбы асноўных культур выкананы: па аўсе—на 37 проц., бульбе—35,9 проц., сіласу—16 проц.

Дзе прычыны такіх ганебных тэмпаў сяўбы па саўгасах Сьвінаводу? Першая з іх заключаецца **ў злачынна-нядбайных адносінах да жывой цягавай сілы** ў значнай частцы саўгасаў. Напрыклад, у саўгасе **«Красіна»,** Клічаўскага раёну, выйшлі са строю 30 % цягавай сілы толькі таму, што збруя не падагнана да коняй. На адным з вучасткаў саўгасу з 87 коняй 42 замулены. У догляде і рабоце на конях агіднейшая абязьлічка. (Дырэктар саўгасу—Цірэнчанка зараз зьнят з работы і аддаецца пад суд).

У саўгасе **імя Блюхэра,** Веткаўскага раёну, з-за дрэннага догляду таксама выйшлі са строю 20 проц. коняй. Такія-ж факты мы наглядаем у саўгасе **«Вішнёўка»** і радзе іншых. Догляд каня яшчэ не наладжан. У большасьці саўгасаў конюхі аплачваюцца толькі ад колькасьці коняй, якія абслугоўваюцца імі, якасьць конскага парку пры гэтым зусім ня ўлічваецца.

Другая ня менш важная прычына адставаньня саўгасаў у сяўбе—нікуды няварта арганізацыя працы. У брыгадах панує ўраўнілаўка. Напрыклад, брыгады плугароў у 5-9 чалавек працуюць разам і атрымліваюць аднолькава. Дзенныя заданьні да брыгад не даведзены. Рабочыя не мабілізаваны на ўзмацненьне тэмпаў сяўбы.

Нельга прайсьці міма таго, што яўна няправільныя дырэктывы аб арганізацыі брыгад былі даны самім трэстам Сьвінавод. Толькі 5 мая, калі саўгасы ўжо выйшлі ў поле, гэта памылка была як быццам выпраўлена. Але на мясцох справа фактычна не зьмянілася.

Трэба таксама адзначыць нездаваль ную работу трактараў. Частка з іх вышла са строю ў першыя дні палявых работ з прычыны нізкай якасьці рамонту. Напрыклад, у саўгасе імя 1-га мая з 8 трактараў працуе толькі 4, рэштка прапрацавалі толькі 1-2 дні. Такія факты ёсьць і ў іншых саўгасах. Але асноўная прычына—гэта непадрыхтаванасьць трактарыстаў і няўмелае скарыстаньне трактараў з-за нераспарадчасьці дырэкцыі раду саўгасаў.

Дырэкцыя Сьвінаводцэнтру не забясьпечыла штодзеннага апэрацыйнага кіраўніцтва ходам пасеўнай кампаніі, несвачасова рэагавала на агіднае адставаньне паасобных саўгасаў. Абломаўскія тэмпы сяўбы іменна характэрны для Сьвінаводтрэсту. Гэта магло здарыцца толькі таму, што тут менш усяго турбаваліся аб перабудове работы па-новаму, аб практычным ажыцьцяўленьні шасьці ўмоў тав. Сталіна.

Якасьць сяўбы ў большасьці саўгасаў у параўнаньні з мінулым годам нясумненна вышэй. Аднак, у радзе месц угнаеньні поўнасьцю не скарыстоўваюцца. У саўгасе **«Горкі-Абчак»** (дырэктар Новікаў) дагэтуль яшчэ ня вывезен гной са сьвінарнікаў. У саўгасе **імя 1-га мая** (аграном Тачыцкі) авёс быў засеян па дрэнным зябліво бежнаежнай папярэдняй падрыхтоўкі глебы.

Нельга ня спыніцца на яўна апартуністычнай тэндэнцыі ў сэнсе скарачэньня пасеўных плошчаў, якая праяўляецца радам саўгасаў і раёнаў. Так, саўгас **імя Блюхэра,** Веткаўскага раёну, ужо намячае скараціць пасеўную плошчу з 4.070 да 2.700 га. Саўгас **«Вейна»,** Магілеўскага раёну, мяркуе скараціць пасеўную плошчу на 800 га. Усяго па саўгасах ёсьць тэндэнцыя скараціць пасеўныя плошчы на 6.000 га. Гэта ня гледзячы на катэгарычную дырэктыву СНК і Наркамзему, якія папярэджваюць супроць усякіх спроб скарачэньня плошчаў па саўгасах Сьвінаводу.

Якія задачы зараз паўстаюць перад саўгасамі? Па-першае, трэба безадкладна ліквідаваць абязьлічку ў доглядзе коняй і рабоце на іх. Конюхі і рабочыя, да якіх прымацаваны пэўныя коні, цалкам адказваюць за становішча цягавай сілы ў саўгасе. Палявыя брыгады павінны быць прымацаваны да пэўных вучасткаў і адказваць за сваячасовы і добраякасны засеў іх.

Перадавыя саўгасы і калгасы, якія скончылі сяўбу, павінны аказаць сацыялістычную дапамогу адстаючым.

Тэмпы сяўбы ў саўгасах Сьвінаводу трэба рэзка ўзьняць і ў бліжэйшыя дні ва што-б там ні стала ліквідаваць адставаньне.

Тав. Ва. Жэін — камсамолец-ударнік саўгасу «Івань», Слуцкага раёну, кі. раўнік зьвяна баранавальшчыкаў. Зьвяно штодзенна перавыконвае заданьне. Норма — 35 га, барануе — 40-42 га. Тлумачыцца гэта тым, што баранавальшчыкі добра дагледаюць прымацаваных да іх коняй.

Ход сяўбы па саўгастрэстах БССР за май месяц 1932 г.

НАЗВА ТРЭСТАЎ.	ПЛЯН СЯЎБЫ.	Выкананьне ў працентах за дэкады		
		На 10 V	На 20 V	На 30 V
Насенаводтрэст	11.860	18,7	33,5	62,3
Малпрамтрэст	40.430	10,6	26,0	44,5
Садагародтрэст	9.263	—	13,8	39,3
Белсельаб'яднаньне	24.690	4,7	9,1	36,8
Сьвінаводтрэст	70.575	4,7	15,3	34,6
Птушкатрэст	4.331	3,1	10,7	27,1
Ільнатрэст	4.890	—	2,1	17,2
Інш. трэсты	18.177	3,9	12,5	46,5
Па ўсіх трэстах БССР	184.216	6,4	17,1	39,8

ЧЫРВОНЫ СЬПІС

саўгасаў-кандыдатаў на прэміяваньне за лепшае правядзеньне веснавой сяўбы

За бальшавіцкае змаганьне па выкананьні плянаў веснавой сяўбы заносім у чырвоны сьпіс наступныя саўгасы:

Па трэсьце „Сьвінавод"

1. Саўгас **«Кухцічы»,** дырэктар **Пілэйка,** пасеўная плошча—242 га, засеяна **100 проц.** (Вузьдзенскі раён)
2. Саўгас **«Негарэлае»,** дырэктар **Шчакалаў,** пасеўная плошча—**531 га,** засеяна **94,5 проц.** (Койданаўскі раён).
3. Саўгас **«Харомцы»,** дырэктар **Лупсякоў,** пасеўная плошча—**713 га,** засеяна **94,2 проц.** (Глускі раён).
4. Саўгас **«Рыме»,** дырэктар **Скараход,** пасеўная плошча—**563** га, засеяна **91,2 проц.** (Капыльскі раён).
5. Саўгас **«Халопенічы»,** дырэктар **Кабакаў,** пасеўная плошча—**601 га,** засеяна **90,8 проц.** (Крупскі раён).

Па Малакопрамтрэсьце:

1. Саўгас **«Завалочьцы»,** дырэктар **Холад,** пасеўная плошча—**973 га,** засеяна **106,9 проц.** (Глускі раён).
2. Саўгас **«Рачкавічы»,** дырэктар **Любецкі,** пасеўная плошча—**361 га,** засеяна **97,5 проц.** (Чырвона-Слабодзкі раён).
3. Саўгас **«Стрэлічава»,** дырэктар **Кучаравы.** пасеўная плошча—**393 га,** засеяна **99,2 проц.** (Хойніцкі раён).
4. Саўгас **«Астрагляды»,** дырэктар **Вількот,** пасеўная плошча—**319 га,** засеяна **98,7 проц.** (Брагінскі раён).

ПАД ЧЭРВЕНЬСКІМ СОНЦАМ У БЕЛМАЛАКОТРЭСЬЦЕ ЎСЁ ЯШЧЭ ДРЭННЫЯ КЛІМАТЫЧНЫЯ ЎМОВЫ

На 1 чэрвеня па саўгасах Малакотрэсту пасеўны плян выканан усяго на 44,3 проц. Апошнія 7 дзён сяўбы далі прырост толькі на 10 проц. Па асноўных культурах—кармовых травах—яшчэ горшыя вынікі. Вікі засеяна 35 проц. пляну, сэрадэлы — 5,8 проц., сіласных культур—24 проц. і кармовых кораньплодаў—32 проц.

З боку многіх кіраўнікоў саўгасаў праяўляюцца яўна апартуністычныя адносіны да сяўбы. Яшчэ і зараз лічаць, што час для пасеву грэчкі не надышоў. Недаацэнка раньняй сяўбы прывяла да таго, што грэчкі засеяна толькі 6 проц.

Асноўнай прычынай недапушчальнага адставаньня саўгасаў зьяўляецца тое, што з боку дырэкцыі Малакотрэсту ня было належнага апэрацыйнага кіраўніцтва ў разгортваньні сяўбы, ня было дана належнага адпору гора-кіраўніком саўгасаў, якія сваю апартуністычную бязьдзейнасьць прыкрываюць «аб'ектыўнай» прычынай — дрэнным надвор'ем. І гэта ня дзіва. Сам намесьнік дырэктара Малакотрэсту т. **Кржэсінскі,** апрача «аб'ектыўных», ня бачыць ніякіх іншых прычын зрыву тэрмінаў сяўбы. Ён заяўляе, што асноўнай прычынай зацяжкі сяўбы саўгасамі паўднёвай зоны паслужылі дрэнныя кліматычныя ўмовы.

Адсутнасьць належнага кіраўніцтва з боку Малакотрэсту паслужыла поводам для бязьдзейнасьці раду кіраўнікоў саўгасаў. Маючы ўсе магчымасьці для поўнага і сваячасовага скончэньня сяўбы, саўгасы **Уваравічы, Бярэзіна, Загараны, Ходцы, В. Навасёлкі** і інш. сяўбу правальваюць. Напрыклад, саўгас **Бярэзіна** павінен засеяць 945 га. Для гэтага ён мае 3 трактары, 72 кані і поўнасьцю забясьпечан работай сілай. Ня гледзячы на гэта на 1 чэрвеня плян пасеву выкананы толькі на 29 проц

Дырэктар саўгасу, замест мабілізацыі масы на выкананьне пасеўных плянаў, займаўся рыбацтвам. Між тым у саўгасе на кожным кроку ўбачыш абураючую безгаспадарчасьць.

Яшчэ горш становішча з сяўбой у саўгасе **Уваравічы,** які мае пасеўнай плошчы 1895 га. На 1-га чэрвеня саўгас засеяў усяго 577 га, што складае 31 проц. пляну. І тут як прычына вы стаўляецца дрэннае надвор'е. У сапраўднасьці-ж прычына невыкананьня пляну заключаецца ў адсутнасьці масавай работы сярод рабочых і асабліва трактарыстаў, кепскай арганізацыі працы. Гэта прывяло да заняпаду працоўнай дысцыпліны, павялічэньня прагулаў і інш.

Дрэнны рамонт, адсутнасьць належнага тэхнічнага догляду дае частыя паломкі і прастоі трактараў да 6 гадзін у суткі. Трактарныя і конныя сяўяркі стаяць нескарыстанымі на складах, а пасеў праводзіцца пераважна па рукамі. Пасеў робяць непратрутаным насеньнем. Толькі 25 мая саўгас Уваравічы перайшоў на 10-цігадзінны рабочы дзень

Дырэктар саўгасу тав. **Буры** займаецца «очковтирательством».

Упаўнаважаныя Белмалакотрэсту, знаходзячыся ў саўгасе шмат часу, ня здолелі дабіцца належнага пералому. Прынятыя меры зусім не забясьпечваюць посьпеху сяўбы.

Далей так працаваць нельга. У апошнія рашаючыя дні дырэкцыя Малакотрэсту павінна забясьпечыць посьпяховае выкананьне пляну сяўбы па ўсёй сваёй сыстэме.

Барысевіч.

ПАЗЫКАЙ 4 ЗАКЛЮЧНАГА ЎЗМОЦНІМ ГАСПАДАРЧУЮ МАГУТНАСЬЦЬ І АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ САЮЗУ

Дакажам сваю гатоўнасьць да сустрэчы 2-ой пяцігодкі

Агульны сход рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу **мекскай чыгуначнай дыстанцыі** пастанавіў вітаць ініцыятыву заводаў імя Сталіна і «Бальшавік» аб выпуску пазыкі імя чацьвертага, заключнага. У адказ на спробы наймітаў капіталу і правакатараў выклікаць інтэрвэнцыю, мы яшчэ шчыльней згуртуем свае рады вакол УсеКП(б) і яе ленінскага ЦК і з посьпехам скончым першую пяцігодку. Запэўнім партыю, што мы будзем актыўнымі ўдзельнікамі стварэньня бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы. Няхай шум савецкіх матораў, аўта-машын, трактараў, грукат вод Дняпра і Волхава заглушыць выцьцё ашалелых імпэрыялістаў, якія бачаць набліжэньне сваёй пагібелі. 100 проц. рэалізацыяй новай пазыкі дакажам, што мы гатовы да сустрэчы другой пяцігодкі. Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр тав. Сталін!

Па даручэньні сходу:
БУЦЬКО, МУРОХ і КОРЗУН.

Тав. Ланеўскі — токар заводу імя Варашылава, падпісаўся на пазыку «Трэці рашаючы» на 162 проц. месячнай зарплаты.

Горача вітаем ініцыятыву перадавікоў

Вялікай хваляй энтузіязму сустрэлі рабочыя МЕНСКАГА ВАГОННА - РАМОНТНАГА ЗАВОДУ «ПОЛЫМЯ РЭВАЛЮЦЫІ» ініцыятыву перадавых прадпрыемстваў аб выпуску новай пазыкі імя чацьвертага, заключнага году. Цэхавыя сходы горача віталі гэту ініцыятыву і цалкам падтрымалі яе.

Асабліва характэрна выступленьне на сходзе старога рабочага заводу, лепшага ўдарніка—маляра т. СЯНЮКЕВІЧА, які, расказаўшы, як рос завод пасьля белапольскай акупацыі, як будуецца ўся наша сацыялістычная гаспадарка, заклікаў усіх рабочых у выпадку задаваленьня просьб заводаў з боку ўраду, поўнасьцю падпісацца на пазыку. Ён заявіў, што ён першым падпішыцца на поўны месячны заработак.

Цэхавыя сходы вынесьлі наступныя пастановы: «Цалкам далучаемся да патрабаваньняў перадавых прадпрыемстваў аб выпуску новай пазыкі і просім урад як можна хутчэй задаволіць нашу просьбу. Мы ведаем, што сродкі, якія мы даем у пазыку дзяржаве, ідуць на разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва, на паляпшэньне матар'яльна - бытавых умоў працоўных мас, даюць магчымасьць заваяваць тэхнічна - эканамічную незалежнасьць Саюзу. Падпіскай на пазыку ўдарым па імпэрыялістычных інтэрвэнтах, якія імкнуцца падарваць наша мірнае будаўніцтва, па клясавым ворагу і яго агентуры

Рабочыя пасажырскага цэху ў ліку 230 чал. выклікалі на сацспаборніцтва па лепшай рэалізацыі новай пазыкі таварны цэх заводу і ўзьнялі перад усімі цэхамі пытаньне аб выкліку на сацспаборніцтва рабочых дэпо ст. Менск МБВ чыг.

Пасажырскі цэх цьвёрда пастанавіў змагацца за першынства на заводзе і ў Менску.

Пазыка пабудовы сацыялізму

БАРЫСАЎ. (Белта). 4-га чэрвеня па ўсіх цэхах **барысаўскага камбінату «Камінтэрн»** адбыліся па-зачарговыя сходы рабочых, на якіх абмяркоўваўся ліст рабочых маскоўскага заводу імя Сталіна аб выпуску новай пазыкі.

Рабочы калектыў камбінату «Камінтэрн» у колькасьці 1.200 чал. у аднагалосна прынятай рэзалюцыі заявіў: «Нашы пазыкі—гэта пазыкі заваяваньня тэхнічна - эканамічнай незалежнасьці Саюзу і пабудовы сацыялізму. Пазыка «чацьвертага, заключнага» яшчэ хутчэй наблізіць нас да дасягненьня гэтай мэты. **Далучаемся да хадайніцтва сталінцаў і просім урад паскорыць выпуск новай пазыкі».**

***

Рэдакцыяй атрыманы рэзалюцыі, якія падтрымліваюць выклік аб выпуску новай пазыкі — работнікаў **Дзяржпляну БССР, Белканторы і Менаддзяленьня Дзяржбанку, Беларускага аддзяленьня «Саюздруку», рабочых лазьняў і пральняў Менску і інш.**



Тав. Сямёнаў — рабочы гакарнага цэху чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава — ударнік фінансавага фронту, падпісаўся на пазыку «Трэці рашаючы» на 175 проц месячнай пэнсіі.

ЧОРНАЯ ДОШКА

За ганебнае адставаньне, за прапушчаныя тэрміны сяўбы, за адсутнасьць канкрэтнай работы па ажыцьцяўленьні 6 умоў т. Сталіна, за слабую мабілізацыю рабочых саўгасаў на пасьпяховае і сваячасовае выкананьне пасеўных плянаў заносім **на чорную дошку** наступныя саўгасы:

Па трэсьце „Сьвінавод":

1. Саўгас **імя Варашылава,** дырэктар **Іваноў,** пасеўная плошча—**1.610** га, засеяна **7,6 проц.** (Бялыніцкі раён).
2. Саўгас **«Добрае»,** дырэктар **Ілюшчэнка,** пасеўная плошча—**1.664** га, засеяна **10,9 проц.** (Мсьціслаўскі раён).
3. Саўгас **«Славянка»,** дырэктар **Даўгалёў,** пасеўная плошча—**619** га, засеяна **11,8 проц.** (Быхаўскі раён).
4. Саўгас **«Старая Беліца»,** дырэктар **Аляксейчык,** пасеўная плошча — **1.211** га, засеяна **11,1 проц.** (Уваравіцкі раён).
5. Саўгас **«Крывое»,** дырэктар **Шэвэраў,** пасеўная плошча—**663** га, засеяна **13 проц.** (Талачынскі раён).
6. Саўгас **«Сталіна»,** дырэктар **Нецяга,** пасеўная плошча — **1.168** га, засеяна **19,6 проц.** (Койданаўскі раён).

Па Малакопрамтрэсьце:

1. Саўгас **«Дзэрнавічы»,** дырэктар **Абрамовіч,** пасеўная плошча — **949** га, засеяна **4,7 проц.** (Нараўлянскі раён).
2. Саўгас **«Асьвея»,** дырэктар **Казак,** пасеўная плошча—**434** га, засеяна **10,9 проц.** (Асьвейскі раён).
3. Саўгас **«Загараны»,** дырэктар **Мельнікаў,** пасеўная плошча—**867** га, засеяна **13,7 проц.** (Гарадоцкі раён).
4. Саўгас **«Вялікія Навасёлкі»,** дырэктар **Касьпяровіч,** пасеўная плошча —**1.140** га, засеяна **19,3 проц.** (Койданаўскі раён).
5. Саўгас **«Габрылелёўка»,** дырэктар **Язупчык,** пасеўная плошча—**967** га, засеяна **19,9 проц.** (Пухавіцкі раён).

У адказ на прыезд тав. Галадзеда калгасьнікі высунулі сустрэчныя пляны па сяўбе

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **тв. Галадзед** па працягу 7 дзён знаёміўся са становішчам ходу сяўбы, з выкананьнем дырэктыў партыі аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў у паўднёвых, заходніх і паўночных раёнах БССР.

У сувязі з прыездам і выступленьнем т. Галадзеда калгасьнікі, рабочыя саўгасаў, МТС і аднаасобнікі адказалі ўздымам творчага энтузіязму і ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па датэрміновым скончэньні сяўбы і пашырэньні пасеўнай плошчы. Так, **калгасьнікі вёскі «Турск»** узялі на сябе абавязак за 2-3 дні скончыць сяўбу і перавыкаваць плян па тэхнічных культурах. Аднаасобнікі арганізавалі брыгаду з 15 чалавек па дапамозе калгасу ў выкананьні плянаў сяўбы.

Камунары **камуны «Маяк»** (Дрысенскі раён) **абавязаліся засеяць звыш пляну 5 гэкт. ільну,** арганізавалі ўдарную брыгаду па абслугоўваньні сьвінафэрмы і рад калгасьнікаў абвясьцілі сябе ўдарнікамі.

Калгасы Прудзінкаўскага сельсавету **«Кастрычнік», «Кліч Леніна», «Новы строй»** абавязаліся засеяць **звыш пляну 15 га ільну** і да 5 чэрвеня скончыць сяўбу.

Калгасьнікі калгасу **«Іскра»** (Плешчаніцкі раён) **выбралі т. Галадзеда ганаровым членам свайго калгасу і высунулі сустрэчны плян па ільне ў 5 гэкт.** Калгасьнікі нацыянальнага польскага калгасу **«Чырвоны камунар»** абавязаліся ў бліжэйшыя дні скончыць сяўбу і цалкам выканаць **сустрэчны плян,** які прынят калгасам у **97 гэкт.**

2 чэрвеня вечарам т. Галадзед выступіў з вялікім дакладам на сходзе **Полацкай** гарадзкой партарганізацыі — «міжнароднае становішча і задачы партарганізацыі». Сход прыняў пастанову аб мабілізацыі 500 камуністаў і камсамольцаў для работы ў брыгадах, па вучастках і калгасах. Усе мабілізаваныя 3 чэрвеня выехалі ў сельсаветы.

„ЗАКРАШЫНСКІ МОХ“ ДАБІЎСЯ ПОЎНАЙ ВЫПРАЦОЎКІ СУТАЧНАГА ЗАДАНЬНЯ

ВОПЫТ І ПОСЬПЕХІ ЯГО РАБОТЫ—НА ЎСЕ ТОРФЗАВОДЫ БССР

У чым карэньні адставаньня „Асінторфу“

Прайшло ўжо больш месяца з таго часу, як на **Асінторфе** распачаўся торфсэзон. Здавалася-б, што за гэты перыяд торфаздабыча павінна была разгарнуцца ўдарнымі тэмпамі, аднак, на сёмнаццаты дзень яна ледзь дасягае 30-35 проц. сутачнага заданьня. На 1 чэрвеня калянцарны плян выканаў толькі на 30,9 проц. За май месяц недавыпрацавана каля 27.000 тон торфу.

Такое недапушчальна нізкае выкананьне пляну тлумачыцца тым, што в першых дзён сэзону ня былі ўзяты бальшавіцкія тэмпы торфаздабычы, ня было разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж вучасткамі і брыгадамі.

«Зьвязда» ўжо сыгналізавала аб тым, што тарфком заводу праяўляе поўную бязьдзейнасьць у галіне разгортваньня масавай работы. І зараз справа ў гэтых адносінах не палепшылася. Асобныя брыгады (Аўдошкіна, Зубава, Корабавай) сваёй ударнай работай ужо даўно даказалі рэальнасьць пляну, але вопыт іх працы ня быў скарыстаны для мабілізацыі мас на барацьбу за максымальнае фарсаваньне торфаздабычы. Лепшыя ўдарнікі з гэтых брыгад дагэтуль яшчэ не прэміяваны і ня ўсе рабочыя ведаюць аб ударных тэмпах іх работы.

Прадсысьпліна сярод рабочых недавальняючая, асаблівая нядбайнасьць наглядаецца з боку матарыстаў торфа-фармовачных машын. Так, 22 мая матарыст машыны № 10 т. **Путаў** зусім не зьявіўся на працу. Матарысты машыны № 3 т.т. **Шастакоў** і **Патроў** спазьніліся на працу на 4 гадзіны. Матарыст машыны № 3 т. Кочас з-за нядбайнасьці сагнуў вал торфамашыны і зламаў чыгунную шасьцярню. У выніку быў вялікі прастой машыны.

Трактарны парк, які зьяўляецца асноўным вытворным сродкам на фрэзэрным вучастку, працуе бяз усялякага кантролю. Ні адзін з трактараў яшчэ не перайшоў на гаспадарчы разрахунак. У выніку перавыдатак гаручага надзвычай вялікі, а нормы выпрацоўкі — нізкія. Маторы ў машынах, з прычыны асадкі балота, сёлета трэба было зьмяніць на больш моцныя. Апошнія прыбылі і ўжо больш месяца ляжаць на складах, аднак, мэханічная майстэрня марудзіць з іх устаноўкай. Гэта не дае магчымасьці скарыстаць поўную магутнасьць торфмашын. Тэхнічна-адміністрацыйны нагляд за работай машын у часе пачных зьмен зусім адсутнічае.

Плян жыльлёвага будаўніцтва пя выкананы. Зараз на заводзе не хапае жыллошчы. Між тым, стандартныя дамы, якія прыбылі з Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату, ужо больш месяца ляжаць несабранымі. Кіраўніцтва заводу тлумачыць гэта адсутнасьцю спэцыялістаў і ня прымае ніякіх мер да таго, каб такіх спэцыялістаў дастаць. Гэтымі днямі на завод павінны прыбыць тарфяніцы для сушкі торфу, і завод стаіць перад фактам адсутнасьці месца для іх разьмяшчэньня.

Пагражаючае становішча з уборкай машына-фармовачнага торфу. З кожным днём здабыты торф займае ўсё большую плошчу, а асушка і ўборка яго з прычыны адсутнасьці патрэбнай колькасьці тарфяніц не праводзіцца. З-за адсутнасьці поля для сьцілкі, завод прымушан быў спыніць працу 11 машыны. Да ўборкі фрэзэрнага торфу завод таксама падрыхтаваўся слаба. Не хапае торфазьбіральнікаў, перапосных вузкакалейных рэек і шпалаў.

Усё гэта патрабуе ад партыйна-прафэсыянальнай арганізацыі Асінторфу рашучага пералому ў кіраўніцтве торфаздабычай.

Х.

Здабыча торфу заводамі Белторфаб'яднаньня

Май 31	Заданьне—6.204 тон Здабыта—2.562 „	Проц. выкан. 41,2	
Чэрвень 1	Заданьне—6.204 тон Здабыта—2.193 „	Проц. выкан. 35,3	

31 мая		1 чэрвеня	
„Закрашынскі мох“	—95,4 % зад.	„Закрашынскі мох“	—100,1 %
„Смалявічы“	—81,3 „	Імя Даўмана	— 65,2 „
„Свабода“	—64,0 „	„Свабода“	— 64,3 „
„1 мая“	—63,3 „	„Шлях сацыялізму“	— 45,2 „
Імя Даўмана	—58,6 „	„Смалявічы“	— 42,5 „
„Бальшавік“	—40,0 „	„Чырвоны сьцяг“	— 35,5 „
„Чырвон. сьцяг“	—34,3 „	„Чырвон. Беларусь“	— 34,0 „
„Шлях сацыялізму“	—34,1 „	Імя 1 мая	— 33,1 „
„Чырвоная Беларусь“	—32,9 „	„Асінторф“	— 31,7 „
„Асінторф“	—26,1 „	„Бальшавік“	— 25,4 „

Першае пасяджэньне аргкамітэту БССП

1 чэрвеня адбылося першае пасяджэньне аргкамітэту Беларускага Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў, створанага літаратурнымі арганізацыямі БССР сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый.

На пасяджэньні вырашан рад арганізацыйных пытаньняў.

Прэзыдыум аргкамітэту выбран у складзе т. т.: Клімковіча (старшыня), М. Лынькова (адказны сакратар), К. Чорнага, А. Александровіча і Х. Дунца. Кандыдаты—т. т. Гараўскі і Швэйдэль.

Дэлегацыя аргкамітэту Усесаюзнага саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў вылучана ў складзе т. т. М. Лынькова, К. Чорнага, А. Александровіча і І. Харыка.

Створаны камісіі: па друку — у складзе т. т. М. Лынькова, Я. Ліманоўскага і І. Харыка; па масавай рабоце — у складзе т. т. П. Галавача, П. Швэйдэля, А. Александровіча, Крапівы і Юдэльсона; па сацыяльна-бытавых пытаньнях—у складзе т. т. І. Гурскага, Іл. Барашкі, Л. Бэндэ, К. Чорнага, Кульбака і Нёманскага.

Пастаноўлена, што пытаньнямі ўкамплектаваньня апарату і сродкамі павінен заняцца прэзыдыум

Даручана камісіі масавай работы ў самы кароткі тэрмін прадставіць у прэзыдыум плян папулярызацыі і растлумачэньня апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна - мастацкіх арганізацый на пэрыфэрыі, у філіялах БелАПП, ЛАЧАФ і БАПКП і літаратурных гурткох. Аргсакратаром арганізацыйнага камітэту выбран Іл. Барашка.

Жыльлёвае будаўніцтва

120 КВАТЭР І... 7 СКРЫНАК ЦЬВІКОЎ

3-га чэрвеня камісія садзейнасьці камунальнаму і жыльлёваму будаўніцтву на чарговым сваім пасяджэньні пад старшынствам тав. **Гарына** зрабіла дэтальны аналіз ходу будаўніцтва стандартных дамоў па лініі жыкаапэрацыі і яе будаўнічай арганізацыі — **Менскага аддзяленьня Белбудканторы.** Даклады і спрэчкі (выступалі т. т. **Левін, Альпяровіч, Гімэльштэйн, Млодак** і інш.) выявілі сумны малюнак.

Пабудова 25 стандартных дамоў у пасёлку «Камінтэрн» цягнецца надзвычай марудна. Дагавор па будаўніцтва гэтых дамоў заключан яшчэ ў мінулым годзе, але да гэтага часу ні адзін дом ня здан у эксплёатацыю. Апраўданьні, якія высунуў кіраўнік аддзяленьня Белбудканторы т. **Евялеўскі,** нясур'ёзныя і былі па чарзе разьбіты ў спрэчках членамі камісіі.

Уся справа ў тым, што кіраўніцтва Менскага аддзяленьня Белбудканторы вельмі спакойна, **вельмі бесстаранна** адносілася да сваіх аб'ектаў будоўлі, што кіраўнікі аддзяленьня **не праявілі выстарчальнай бальшавіцкай упартасьці і ініцыятывы,** каб перамагчы труднасьці, якія ўзьніклі на іх шляху.

Як гэта ня дзіўна, аддзяленьне Белбудканторы **ня мае нават апэрацыйнага пляну будаўніцтва,** працуе ўрыўкамі, спадзяючыся выключна на самацёк. Работы ідуць «шырокім» фронтам, замест таго, каб сканцэнтраваць сілы і будматар'ялы на адным-двух вучастках, скончыць іх і рушыцца далей. Таму пабудова стандартнага дому **замест аднаго месяца працягваецца амаль год.** Рабочыя не разьбіты на пастаянныя вытворчыя брыгады. Склад брыгад вельмі цякучы. Сыстэма работы па жывым канвэеры ня ўжываецца. Таму брыгады ня маюць матчымасьці спэцыялізавацца на пэўных працэсах і ўзьняць прадукцыйнасьць працы. Па гэтай-жа прычыне наглядаецца вялікая цякучасьць рабсілы, **сыстэматычнае зьніжэньне колькасьці рабочых.**

З 25 стандартных дамоў у пасёлку «Камінтэрн», якія павінны былі быць зданы ў эксплёатацыю самае позьняе ў пачатку мая, сабраны і закладзены толькі 17. Апрача гэтых 25 дамоў аддзяленьне Белбудканторы павінна пабудаваць у 1932 г. яшчэ 28 стандартных дамоў. Калі кантора пачне іх будаваць — невядома.

23 мая сакратарыят Менгаркому КП(б)Б абавязаў Менбудканторы, Белжылсаюз, пад асабістую адказнасьць тав. **Евялеўскага,** да 15 чэрвеня здаць поўнасьцю пад засяленьне 12 дамоў у пасёлку «Камінтэрн» і 4 дамы для рабочых фабрыкі «Кастрычнік» і да 15 ліпеня здаць таксама 7 дамоў у пасёлку «Камінтэрн». У сувязі з гэтым гарком абавязаў кіраўніка аб'яднаньня будматар'ялаў тав. **Нісьневіча** адпусьціць канторы 100 тыс. штук цэглы і кіраўніцтва заводу «Камунар» тэрмінова зьвярнуць аддзяленьню Белбудканторы 27 скрынак цьвікоў.

На пасяджэньні камісіі садзейнасьці выявілася, што тэрміны сарваны. Тав. Нісьневіч ня выканаў пастановы сакратарыяту гаркому і ня даў цэглы. Кіраўніцтва заводу «Камунар» не зьвярнула прысвоеных цьвікоў. А тав. Евялеўскі на пасяджэньні камісіі садзейнасьці заявіў, што невыкананьне гэтых двух мерапрыемстваў пазбаўляе яго магчымасьці здаць да 15 чэрвеня 16 дамоў і нават, калі ён матар'ялы атрымае сёньня (3 чэрвеня), дык ён дамы здасьць **не раней 5 ліпеня.**

Такім чынам ні адзін з таварышоў, на якіх гарком усклаў пэрсанальную адказнасьць за сваячасовую здачу 16 дамоў, ня выканаў даручанай яму работы.

Толькі 3 чэрвеня аддзяленьне Белбудканторы пачало вазіць 40 тыс. цаглін, атрыманых паводле распараджэньня гарсавету ад Менбудаўскіх цагельняў. Што датычыць 7 скрынак цьвікоў для тынкаваньня, якія патрэбны аддзяленьню Белбудканторы для скончэньня 16 дамоў, дык і ў дзень пасяджэньня камісіі садзейнасьці гэта пытаньне ня было вырашана.

Прадстаўнік Белдзяржснабу т. **Красноўскі** абяцаў выдаць цьвікі, калі... гарсавет **даб'ецца** нараду ад Мэтызаб'яднаньня. Белмэталяаб'яднаньне, як заказчык гэтага будаўніцтва, настолькі «зацікаўлена» ў тым, каб хутчэй даць кватэры **сваім рабочым,** што ня можа, нарэшце, ня хоча, шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў дапамагчы **будаўніцтву** нарай дзесяткаў скрынак цьвікоў. Добры і «шэф» будаўніцтва — завод «Камунар»: замест таго, каб актыўна дапамагчы аддзяленьню Белбудканторы скончыць пасёлак у тэрмін, ён прысвойвае 27 скрынак цьвікоў, без якіх пабудова стандартных дамоў стаіць пад пагрозай зрыву. **І грамадзкія арганізацыі заводу на гэта не рэагуюць.**

Разам з тым выявілася, што па віне заводу стандартных дамоў былі перабоі ў забесьпячэньні пасёлку стандартнымі дэталямі і што дамы прывозіліся ня поўнымі камплектамі. Узаемаадносіны паміж заводам і аддзяленьнем Белбудканторы яшчэ не афармлены—не заключан нават дагавор, бо **завод яшчэ ня склаў калькуляцыі сваёй прадукцыі.**

Праграма заводу прадугледжвае выпуск у 1932 г. 100 дамоў, выпушчана зг. пяць месяцаў (студзень — май) усяго... **12 дамоў.** «Зьвязда» пісала ўжо аб асноўных прычынах такога ганебнага прарыву—адсутнасьці моцнага кіраўніцтва, слабым разьвіцьці сацспаборніцтва і ўдарніцтва, адсутнасьці гаспадарча - разрахункавых брыгад і г. д. Тав. **Рыс** — новы дырэктар заводу — да гэтых прычын дадаў яшчэ некалькі: назіраецца адтэй толькі маламоцнай лесапільнай рамы, якая прапускае толькі 30 проц. бярвеньня, астатнія вельмі вялікія для яе; слабая электраўстаноўка — патрэбен трансфарматар у 100 кілёват, ёсьць толькі ў 30 кілёват; патрэбна 10 цыркулярных піл — ёсьць толькі 3; ня выканана пастанова гаркому КП(б)Б аб узмацненьні партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва на заводзе: да гэтага часу на заводзе няма сакратара парт'ячэйкі і старшыні заўкому.

Рад цікавых даных прывёў у сваім судакладзе прадстаўнік Камунбанку тав. **Лямпэрт.** Ён даказаў, што аддзяленьне Белбудканторы разгарнула работу толькі **на 20 проц.** Наглядаецца імкненьне абыйсьці ліміты кошту будаўніцтва. Ёсьць шмат фактаў безгаспадарчасьці. У прыватнасьці, матар'ялы, завезеныя на ўдарную будоўлю дому «Пяты дзень ударніка», перавезены на іншыя будоўлі. Гэта каштавала шмат грошай і ляжа накладным расходам на будаўніцтва.

Атульнае зьдзіўленьне выклікала паведамленьне т. Лямпэрта, што ЖБКТ «Чырвоны электрык» заключыў **два дагавары** на адно і тое-ж будаўніцтва — з аддзяленьнем будканторы і Менбудам.

Кіраўнік Камунбанку тав. **Розэнгауз** зусім правільна паставіў пытаньне — **што робяць прафсаюзы?** Чаму нічога ня чуваць аб сацспаборніцтве паміж будоўлямі, чаму забываюць аб выкананьні шасьці ўмоў тав. Сталіна?

***

Да якіх вывадаў прышла камісія садзейнасьці? Становішча з жыльбудаўніцтвам вельмі сур'ёзнае. Безадказныя адносіны будаўнічых арганізацый да выкананьня праграмы пабудовы стандартных дамоў, адсутнасьць дапамогі зацікаўленых устаноў, невыстарчальная мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў — ставяць гэту праграму пад пагрозу невыкананьня.

Асабліва рэзкага асуджэньня заслугоўваюць паводзіны **Нісьневіча і дырэктара заводу «Камунар»,** якія ня выканалі пастановы гаркому партыі. Камісія садзейнасьці лічыць, што **гэтыя асобы павінны быць прыцягнуты да партыйнай адказнасьці.**

Камісія садзейнасьці парашыла стварыць разам з гарсаветам і гарКК брыгады ўдарнікаў-добраахвотнікаў і абсьледваць склады, базы, тэрыторыі заводаў і вывіць лішкі будматар'ялаў, у прыватнасьці, жалеза і цьвікоў.

Камісія садзейнасьці парашыла зьвярнуцца ў рэдакцыі **«Рэчыцкай праўды»** і Аршанскай газэты **«Ленінскі прызыў»** з просьбай абсьледваць становішча на цьвіковых заводах **«Інтэрнацыянал» і «Чырвоны Кастрычнік»** і праверыць, ці сапраўды заводы вырабляюць галоўным чынам вялікія цьвікі за кошт дробных, ганяючыся толькі за колькаснымі паказальнікамі (тэнажам) за кошт якасьці і асартымэнту (паводле заявы тав. **Альпяровіч).**



Выраб бязцьвіковага шчыту на заводзе стандартных дамоў (Менск).

Краіна сацыялізму павінна мець добрыя дарогі

Уступайце ў спаборніцтва за пяршынства

Выкананьне пляну асноўных работ дарбудаўніцтва ў апошнюю пяціднеўку мая не дало колькі-небудзь значнага зруху наперад. Супроць папярэдняй пяціднеўкі агульны прырост загатоўкі і вывазкі да трасы каменю, гравія, лесу і пяску складае ў сярэднім 1 проц. Земляныя работы на 1 чэрвеня выкананы на 14 проц., брукаваньне — 17 проц., россып шчэбню — 5 проц. і ўкатка —3 проц. Гэта зусім ганебныя лічбы. У выданым 31 мая загадзе па Галоўдартрансе адзначаецца, што начальнікі вучасткаў ня здолелі па-бальшавіцку разгарнуць будаўніцтва. Апартуністычны самацёк, адсутнасьць арганізаванага набору рабочай сілы і барацьбы за поўнае скарыстаньне мэхавізмаў і транспарту — галоўныя прычыны гэтага. Загад патрабуе ад усіх зьвеньняў Галоўдартрансу і Белдарбуду рашучай перабудовы для забесьпячэньня неадкладнага пераломy ў рабоце.

Пытаньні культурна - бытавога абслугоўваньня, наладжаньне грамадзкага харчаваньня на дарбудаўніцтве маюць важнейшае значэньне. Дарожныя прафарганізацыі павінны паказаць бальшавіцкія ўзоры ў гэтай рабоце. **Тав. Гікало** на апошняй нарадзе па дарожным будаўніцтве сказаў: «Трэба зьвярнуць увагу на якасьць грамадзкага харчаваньня. Можна адпусьціць шмат прадуктаў, але калі іх дрэнна прыгатаваць, дык грош цана ўсім гэтым прадуктам... Пытаньне заключэцца ў тым, каб правільна выкарыстаць тое, што адпускаецца, каб той паёк, тыя харчы, якія адпускаюцца рабочым, дзе-небудзь не засталіся-б, каб яны дайшлі да рабочага поўнакаштоўным пайком...». Змагацца за выкананьне гэтага, маючага вялікае практычнае значэньне ўказаньня т. Гікало—абавязак усіх арганізацый на будаўніцтвах.

Мы друкуем сёньня палажэньне аб конкурсе на лепшае правядзеньне месячніка штурму дарожнага будаўніцтва. Умовы яго павінны быць даведзены да самых шырокіх мас. Конкурс — магутны сродак уцягненьня ў спаборніцтва ўсіх раёнаў, арганізацый, асобных ударнікаў. У барацьбу за пяршынства павінны ўступіць дзесяткі тысяч працоўных.

Роля цэнтральнага, раённага і асабліва дарожнага друку ў барацьбе за выкананьне пляну дарбудаўніцтва выключна вялікая. Папулярызацыя задач месячніка, умоў конкурсу, закону аб працудзеле насельніцтва, мабілізацыя вакол гэтага мас, паказ станоўчага вопыту лепшых брыгад і асобных ударнікаў, арганізацыя спаборніцтва паміж сельсаветамі, калгасамі, вёскамі, асобнымі ячэйкамі КСМ, Аўтадору і г. д., выкрыцьцё канкрэтных зрыўшчыкаў дарожнага будаўніцтва — вось галоўныя задачы друку.

Шырока разгарнуўшы палітычна-масавую работу забясьпечым бальшавіцкую барацьбу за добрую дарогу, за заваяваньне пяршынства ў конкурсе.

Палажэньне аб конкурсе на лепшае правядзеньне месячніка штурму дарожнага будаўніцтва

Дарожнае будаўніцтва БССР у 4 завяршаючым годзе пяцігодкі мае вялізарнае значэньне.

Толькі пры ўмове актыўнага ўдзелу кожнага РВК, сельсавету, МТС, калгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў---аднасобнікаў, лепшых ударнікаў, спэцыялістаў, камсамольцаў друку, Аўтадору, усёй пралетарскай савецкай грамадзкасьці могуць быць выкананы як колькасныя, так і якасныя паказальнікі пляну дарбудаўніцтва.

Конкурс мае мэтай садзейнічаць шырокаму разгортваньню актыўнасьці рабочых, савецкіх і грамадзкіх арганізацый, калгасна-сялянскіх мас, спэцыялістаў і інш. у справе барацьбы за бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні месячніка штурму бездарожжа.

Умовы конкурсу

1. Лепшая распрацоўка і хутчэйшае давядзеньне да кожнага калгасу, вёскі пляну дарбудаўніцтва з паказаньнем часу выхаду на работу і месца працы.

2. Лепшае выкананьне пляну дарбудаўніцтва як колькаснага, так і якаснага, таксама скарыстаньне працудзелу насельніцтва на ўстаноўленых тэрмінах.

3. Правільная арганізацыя вытворчых брыгад у калгасах, вёсках і лепшае выкананьне вытворчых заданьняў па дарбудаўніцтве.

4. Арганізацыя перадачы вопыту работ РВК, сельсаветаў, лепшых брыгад, калгасьнікаў, сялян і інш. у практыку аднаведных арганізацый другіх раёнаў.

5. Ахоп усіх працоўных сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

6. Арганізацыя рэгулярнага выпуску насьценгазэт, шматтыражак і арганізацыя працы з рабкорамі. Папулярызацыя ў друку карысьці добрых дарог. Асьвятленьне ў друку адмоўных і станоўчых бакоў працы партыйных, савецкіх, грамадзкіх арганізацый і інш.

7. Лепшае абслугоўваньне культурна-бытавых патрэб працоўных.

8. Лепшая дапамога выкананьню пляну і скарыстаньне працудзелу насельніцтва з боку ЛКСМ і грамадзкіх арганізацый у раёнах, ячэек Аўтадору, райпрафсаветаў, школ і інш.

9. Лепшая пастаноўка вучоту зробленых работ і скарыстаньня працудзелу насельніцтва.

Прэміяваньне

Для прэміяваньня лепшых раёнаў, сельсаветаў, МТС, рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, брыгад, брыгадзіраў, лепшых ударнікаў, дарожных спэцыялістаў, камсамольцаў, ячэек Аўтадору, друку, школы і інш., якія лепш выконваюць пляны і скарыстоўваюць працоўны ўдзел насельніцтва ў дарбудаўніцтве, устанавіць наступныя прэміі:

1) **3 прэміі раёнам**—20.000 руб. (Легкавая машына, грузавая машына АМО, або стацыянарнае кіно); 2) **15 прэмій сельсаветам**—15.000 руб. (1 стацыянар. кіно, 2 перасоўкі, 6 радыёкропак, 3 прэміі—абсталяваньне сельсаветам, 5 прэмій--абсталяваньне хатчытальень); 3) **24 прэміі калгасам**—25.000 руб. (3 трактары, 10 ясьляй (утрыманьне ясьляй), 5 матацыклаў, 5 бульбакапалак, 1 масла-завод; 4) **15 прэмій старшыням сельсаветаў** — 3.000 руб.; 5) **15 прэмій старшыням калгасаў**—5.000 руб.; 6) **40 прэмій брыгадзірам**—2.500 руб.; 7) **100 прэмій лепшым ударнікам**—6.000 руб.; 8) **Камсамольскім ячэйкам** — 20.000 руб. (бібліятэкі, струн. аркестры, скураныя гарнітуры, прамтавары); 9) **Друк цэнтральны**—2 прэміі—14.000 руб.; 10) **Друк раённы**—3 прэміі — 16.000 руб.; 11) **Аўтарод**—3 прэміі—6.000 руб.; 12) **10 прэмій дарожным інспэктарам і тэхнікам**—4.000 руб. (грашовыя прэміі, гарнітуры, пасылка на курорты, стыпэндыі на курсы перакваліфікацыі); 13) **30 прэмій дзесятнікам і сельскім дарожным арганізатарам**—5.000 руб. (грашовыя прэміі, курорты, стыпэндыі на курсы перакваліфікацыі); 14) **школам**—30 прэмій—5.000 руб.; 15) **членам сельсаветаў**—50 прэмій—2.500 р.; 16) **МТС**—2 прэміі—4.000 руб. Усяго на суму 150.000 руб.

Матар'ял для прэміяваньня лепшых па выкананьні пляну і скарыстаньня працудзелу насельніцтва перапрацоўваецца на мясцох, зацьвярджаецца раённымі штабамі па барацьбе з бездарожжам і накіроўваецца ў Менск у Цэнтральны штаб барацьбы з бездарожжам.

Нач. Галоўдартрансу БССР — ФРУМКІН.

С. Гозман

ДА ГАДАВІНЫ ПРАМОВЫ Т. СТАЛІНА ПРЫЙСЬЦІ З НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ Ў ВЫКАНАНЬНІ 6 УМОЎ

23 чэрвеня спаўняецца гадавіна са дня прамовы тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў. Шэсьць умоў т. Сталіна зьявіліся магутнай зброяй у барацьбе за выкананьне народна-гаспадарчых плянаў, за ажыцьцяўленьне пяцігодкі ў чатыры гады. За гэты год рад прадпрыемстваў, на аснове рэалізацыі шасьці ўмоў, дабіліся вялізарных посьпехаў у выкананьні прамфінпляну. Завод «Бальшавік», Гомсельмаш, віцебская акулярная фабрыка, магілёўская шаўковая фабрыка і інш. паказалі ўзоры таго, як трэба ажыцьцяўляць указаньні прадсэдыра партыі.

Аднак, ёсьць прадпрыемствы, дзе гэтыя шэсьць умоў перамогі не каронены ў вытворчасьць, дзе жыве яшчэ абязьлічка, ураўнілаўка, дзе арганізацыі мала клапоцяцца аб паляпшэньні рабочага снабжэньня, аб належным арганізацыі працы і г. д.

Нядаўна Наркампрацы, пры ўдзеле рабочай грамадзкасьці — ФЗМК, рабочых брыгад і ТНБ, правёў праверку выкананьня 6 умоў на радзе віцебскіх фабрык і заводаў.

Праверка выявіла, што побач са значным зрухам у ажыцьцяўленьні указаньняў т. Сталіна (большы ахоп удзельшчыкаў, выкарэненьне дробнабуржуазнай ураўнілаўкі) ёсьць яшчэ ад істотных непаладкаў, якія самым адмоўным чынам адбіваюцца па выкананьні прамфінпляну.

У гэтым артыкуле мы спынімся на пытаньнях арганізацыі працы, ліквідацыі ўраўнілаўкі і тэхнічнага нармаваньня.

Недавыкананьне пляновых паказальнікаў па прадукцыйнасьці працы, лішкі рабсілы, няправільная расстаноўка і скарыстаньне рабочых прывялі да значных перавыдаткаў фондаў зарплаты на радзе заводаў. Так, напрыклад, завод «Чырвоны мэталіст», выканаўшы вытворчую праграму за першы квартал 1932 г. на 96,7 проц., перавыдаткаваў фонд зарплаты на 66.000 руб. супроць пляну і на 80.000 руб. супроць фактычнага выкананьня вытворчай праграмы. Шчаціннa-шчотачны камбінат, поўнасьцю выканаўшы вытворчую праграму за першы квартал, перавыдаткаваў зарплату ў разьмеры 52.000 руб.; фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» — 67.000 руб.

У чым прычына гэтых вялікіх перавыдаткаў?

Раней — у чацьвертым квартале мінулага году гаспадарнікі імкнуліся тлумачыць перавыдаткі прастоямі з-за перабояў у электра-снабжэньні. Зараз гэта прычына цалкам адпадае.

Побач са звышнармовымі работамі, часта зусім непатрэбнымі, на якія выдаткоўваецца шмат сродкаў («Чырвоны мэталіст» — 14.458 руб., шчаціннa-шчотачны камбінат—на 12.435 руб.) **«аднэй з асноўных прычын перавыдатканьня фондаў зарплаты зьяўляецца ўсё яшчэ існуючая сыстэма незаконных даплат» (Постышаў).** На заводзе «Чырвоны мэталіст» гэтыя незаконныя даплаты іншы, галоўным чынам, па лініі самавольнага павялічэньня расцэнак майстрамі. Так, зборка плугу, паводле норм ТНБ, расцэньваецца ў 37 руб. 60 к.; майстар самавольна «акругляе» гэту расцэнку да 40 руб.; пачасоўшчыкам устаноўлена зарплата ў 86 руб.; майстар павялічвае яе да 100 руб.

У мэханічных цэхах і на рамонтных работах майстры бескантрольна, выпісваючы нарады на работу, вызначаюць аплату «па сваім поглядзе», прычым, каб ня кідалася ў вочы самавольна павялічаная аплата, яны не паказваюць у нарадах тэрміну пачатку і скончэньня работ.

Ня дзіва, што ў выніку такой «сыстэмы» заработак паасобных рабочых на «Чырвоным мэталісьце» даходзіў да 700 руб. у месяц. Група рабочых шчаціннага камбінату з 5 чал. за работу на працягу 2-х дзён атрымала ад начальніка цэху 360 руб.

Тут, як мы бачым, **зьдзельшчына яўна падмяняецца акорднай сыстэмай аплаты.**

Далей, перавыдаткі фонду зарплаты ідуць па лініі няправільнай расстаноўкі рабсілы, нерацыянальнага скарыстаньня кваліфікаваных рабочых. Часта рабочы-фармоўшчык 6-га разраду выконвае работу, якая тарыфікуецца па 2-м разрадзе і яму даплачваецца розьніца ў зарплаце. Толькі за адзін сакавік такія даплаты па шчотачным камбінаце складалі 4.765 руб. — больш 10 проц. агульнай сумы перавыдатку фонду зарплаты. Такая расстаноўка рабсілы зводзіць на нішто прынцып аплаты па працы, тут фактычна аплачваецца ня выкананая работа, а прысвоены разрад.

Дырэктыва XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі аб тым, што **«ў аснову правільнай арганізацыі працы і ўнутрызаводзкага плянаваньня павінна быць пакладзена тэхнічнае нармаваньне»** яшчэ не знайшла патрэбнага адлюстраваньня ў рабоце гаспадарчых органаў і прадпрыемстваў.

На некаторых прадпрыемствах зусім не наладжана работа па падрыхтоўцы кадраў па тэхнармаваньні. Па керамічным трэсьце, які яднае 6 заводаў, няма ні аднаго работніка па тэхнармаваньні. Завод «Чырвоны мэталіст» паслаў рабочага на курсы тэхнармоўшчыкаў, але не стварыў для яго аднаведных бытавых умоў, у выніку рабочы пакінуў курсы. На шчотачным камбінаце тарыфна - нармавачнае бюро фактычна існуе толькі на паперы, бо патрэбная работа не праводзіцца. Добра пастаўлена нармавачная работа на акулярнай фабрыцы, але, на жаль, вопыт гэтай работы не перададзены іншым прадпрыемствам Віцебску.

З-за дрэннай пастаноўкі нармавачнай работы процант прыработку на паасобных работах надзвычай ненармальны. На шчотачным камбінаце, дзе рад норм устаноўлен на «вока», процант прыработку ў сакавіку даходзіў да 96 проц., па вязьніцы — да 92 проц. і г. д.; на заводзе «Чырвоны мэталіст» сярэдні процант выпрацоўкі па малярным цэху дасягаў 80,9 проц., па такарным — 74 проц., а па некаторых відах работ ён даходзіў нават да 124—140 проц.

Зразумела, што такая, з дазволу сказаць, «перабудова» зарплаты не магла спрыяць выкарчоўваньню дробна-буржуазнай ураўнілаўкі. Па шчотачным камбінаце сярэдняя зарплата рабочага 5-га разраду (шчаціннны цэх) складала 7 руб. 17 кап., а 6-га разраду (за адзін і той-жа месяц) — 6 р. 62 к.; па кісьця-вязальным цэху 5-ты разрад атрымліваў 6 руб. 80 к., а 6-ты — 5 руб. 49 кап.

На заводзе «Чырвоны мэталіст» сярэдні заработак лідэйшчыка 6-га разраду складаў 10.02 к., а 7-га — 7 р. 98 к.; у такарным цэху 6-га — 14 руб. 23 кап., а 7-га — 12 р. 73 к.

Для таго, каб сапраўды зьнішчыць ураўнілаўку і адрозьніваць кваліфікаваную работу ад некваліфікаванай, цяжкую працу ад лёгкай, неабходна зьвярнуць увагу ня толькі на суадносіны паміж разрадамі, але паміж рознымі прафэсіямі аднолькавых разрадаў. Інакш нельга ліквідаваць такія зьявішчы, калі рабочы 5-га разраду дрэваапрацоўчага цэху «Чырвонага мэталіста» (больш лёгкая праца) атрымлівае 9 руб. 59 к., такар таго-ж разраду — 8 руб. 17 к., каваль — 7 руб. 37 к.

Новы закон аб аплаце браку і прастою, які мае вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне, і накіраван на паляпшэньне якасьці прадукцыі і, у сувязі з гэтым, на ўздым дабрабыту шырокіх мас, павінен быць поўнасьцю ажыцьцёўлены. IX усесаюзны зьезд прафсаюзаў прапанаваў **«весьці рашучую барацьбу са скажэньнямі ў гэтай галіне і спробамі паасобных гаспадарчых органаў захаваць стары парадак аплаты браку і прастояў».**

Трэба ўдарыць па такіх фактах, калі, напрыклад, для абыходу закону, прапануецца рабочаму прысьці пасьля работы для пераробкі і выпраўленьня браку. На некаторых прадпрыемствах (шчотачны камбінат) зусім не наладжан улік браку. Гэтымі днямі меў месца такі факт: нядобраякасная шчаціна прапала праз прыёмшчыкз, бракер і трапіла на склад; толькі тады, калі дзяржаўны бракер заўважыў брак, адміністрацыя парашыла перадаць шчаціну на пераробку ўсяму цэху з паніжанай аплатай. З-за адсутнасьці ўліку ствараецца поўная абязьлічка, барацьба з якой яшчэ зусім невыстарчальная.

«Між тым, барацьба з абязьлічкай ва ўсіх яе праяўленьнях — гэта ёсьць вузлавое пытаньне змаганьня за правільную арганізацыю працы» (з прамовы т. Постышава на XVII партканфэрэнцыі).

Трэба прызнаць зусім недапушчальным той факт, што на цагельнях новы парадак аплаты браку і прастояў зусім ігнаруецца і да гэтага часу яшчэ не ўведзен.

Рашуча змагаючыся са скажэньнямі новага парадку аплаты, органы працы павінны **«арганізаваць усіх рабочых на барацьбу з прастоямі і бранам. У гэтай барацьбе арганічна злучаюцца клопаты аб павышэньні зарплаты рабочых са змаганьнем за прамфінплян».** (Л. Кагановіч).

Задача ўкараненьня шасьці ўмоў тав. Сталіна поўнасьцю пашыраецца і па дзяржаўны, савецкі і каапэрацыйны апарат. У выкананьне дырэктыў ураду Наркампрацы БССР распрацаваў дыфэрэнцыяваную сыстэму аплаты рабочых і служачых, якая павінна ўжывацца на аснове строгай ацэнкі кваліфікацыі, стажу і якасьці работы кожнага работніка савецкага апарату ў паасобку. Праведзеная праверка выявіла рад парушэньняў гэтай сыстэмы. Не гаворачы аб тым, што многія ўстановы апартуністычна адносіліся да пераводу апарату на зьдзельную і прэміяльна - захвачваючую сыстэму аплаты дапушчан рад парушэньняў акладаў, вызначаных у парадку дзяржаўнага нармаваньня (віцебскі прамтрэст, Тэкстыльаб'яднаньне, гарсавет, сампрамсаюз, банк і інш.).

Яскравы прыклад: у канторы аднаго з прадпрыемстваў Віцебску галоўбух атрымлівае аклад у два разы больш, чым замежны спэцыяліст - інжынэр, які працуе на гэтым-жа прадпрыемстве.

**Прысьці да першай гадавіны прамовы т. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў з новымі посьпехамі ў выкананьні шасьці ўмоў, у сацыялістычнай арганізацыі працы, у паляпшэньні матар'яльна - бытавых умоў рабочых мас — галавая задача ўсіх парт

АБ СТАНОВІШЧЫ РАЗГОРТВАНЬНЯ КАЛГАСНАГА ГАНДЛЮ

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае зусім нездавальняючую работу Калгасцэнтру і яго сыстэмы па разгортванні калгаснага гандлю і, што з боку партыйных, савецкіх, прафсаюзных і каапэрацыйных арганізацый ня было зьвернута належнай сур'ёзнай увагі на гэта важнейшае пытаньне.

Улічваючы асаблівую важнасьць апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і ўраду Саюзу аб збожжа - мясазагатоўках і гандлі калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных працоўных сялян, якія (пастановы) маюць выключна важнае гаспадарча - палітычнае значэньне ў справе разгортваньня таваразвароту, мабілізацыі дадатковых рэсурсаў для палепшэньня снабжэньня працоўных арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць гаркомы і райкомы КП(б)Б, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія, каапэрацыйныя і калгасныя арганізацыі разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод рабочых, калгасьнікаў і працоўных сялян аднаасобнікаў аб значэньні і практычным ажыцьцяўленьні вышэй пакінутых пастаноў партыі і ўраду з абавязковым давядзеньнем гэтых пастаноў да кожнага рабочага і калгасьніка. Увязаць прапраноўку гэтых пастаноў і ўсю масавую работу з задачамі пасьпяховага правядзеньня сяўбы, пашыраньня засеваў збожжавых, гародніны, гадоўлі маладняка, развядзеньня трусоў і птушак, адкорму, пагулу жывёлы і максымальнага павялічэньня таварнага выхаду прадукцыі з тым, каб за гэты лік забясьпечыць стварэньне дадатковых фондаў для разьвіцьця гандлю калгасьнікаў.

2. Абавязаць гарсавету і РВК пад адказнасьць старшынь да 10 чэрвеня прывесьці ў належны выгляд базары, зараз-жа разгарнуць на базарах будаўніцтва ларкоў, латкоў з прыцягненьнем гандлёва - каапэрацыйных і калгасных арганізацый, максымальна разгортваючы іх ініцыятыву і шырока скарыстоўваючы мясцовый будаўнічы матар'ялы з тым, каб на працягу чэрвеня ўжо была пабудавана на асноўных базарах пралетарскіх цэнтраў патрэбная колькасьць ларкоў і латкоў.

Даручыць ЭКАСА ў дэкадны тэрмін вызначыць плян разгортваньня новых базараў, асабліва ў раёнах повапабудоў, і прамысловых цэнтраў, а таксама плян разгортваньня гандлёвай сеткі на базарах у тым ліку і новых, і далажыць ЦК.

У пяцідзённы тэрмін ва ўсіх гарадох і раёнах вызначыць дні гандлю на базарах, зыходзячы з таго, каб базары наладжваліся не радзей 2 разоў у тыдзень. Аб днях шырокага разгортваньня гандлю па базарах павінны быць добра паведамлены калгасьнікі і бядняцка - серадняцкія масы. На ўсіх базарах вывесіць аб'явы, плякаты з вытрымкамі з пастановы ЦВК і СНК СССР аб парадку правядзеньня гандлю сельска - гаспадарчымі таварамі калгасамі, калгасьнікамі і працоўнымі сялянамі аднаасобнікамі (аб гандлі па цэнах, якія складаюцца на рынку, аб вызваленьні гандлю ад падаткаў і зборaў і г. д.). Гарсаветам забясьпечыць кіраўніцтва базарамі, асабліва ў дні шырокага гандлю, вылучаючы для гэтага адказных асоб.

3. Папярэдзіць ГК і РК КП(б)Б аб недапушчэньні якіх-бы там ні было спроб адміністрацыйнага рэгуляваньня цэн на базарах па продажу калгасамі і калгасьнікамі сваёй прадукцыі. Поўнасьцю ажыцьцявіць пастанову ЦВК і СНК, што гандаль калгасаў, калгасьнікаў наладжваць па цэнах, якія складаюцца на рынку, а гандаль калгасных аб'яднаньняў — па цэнах ня вышэй сярэдня - камэрцыйных Дзяржгандлю. Устанавіць строгі кантроль на базарах за поўным і тэрміновым правядзеньнем пастаноў ЦВК і СНК аб вызваленьні гандлю сельскагаспадарчымі прадуктамі калгасаў, калгасьнікаў і працоўных сялян аднаасобнікаў ад рэспубліканскіх і мясцовых падаткаў і зборaў і недапушчэньні перагібаў у справе спагнаньня разовых зборaў для пакрыцьця выдаткаў па ўборцы базараў і ўтрыманьні іх у чыстаце, строга прытрымліваючыся разьмераў, устаноўленых пастановай ЦВК і СНК Саюзу.

Асаблівую ўвагу ЦК звярнае на неабходнасьць правядзеньня рашучай барацьбы са спэкуляцыяй і дастасаваньня рашучых мер да выкараненьня прыватных гандляроў перакупшчыкаў.

4. Прапанаваць Белкаапсаюзу зараз-жа прыступіць да арганізацыі сеткі культурных чайных на базарах для абслугоўваньня калгасьнікаў, працоўных сялян аднаасобнікаў, якія прывозяць рэалізаваць на базары сваю прадукцыю. Гарсаветам забясьпечыць для абслугоўваньня калгасьнікаў у базарныя дні арганізацыю на буйных базарах у пралетарскіх цэнтрах даведачнага бюро, цырульняў, мэдыцынскіх пунктаў, пастаялых двароў. У пяцідзённы тэрмін даць канкрэтныя заданьні адпаведным арганізацыям з указаньнем тэрмінаў іх выкананьня.

5. Улічваючы асабліва важнае значэньне разгортваньня гандлю на базарах прамтаварамі, прапанаваць Белкаапсаюзу, Белгандлю і Белкампрамсаюзу шырока разгарнуць гандаль з боку сваіх сыстэм на базарах з ларкоў, латкоў, развозак прамтаварамі і прадметамі хатняга ўжываньня сялян, забясьпечыўшы гандаль дастатковай колькасьцю тавараў. Белкаапсаюзу адначасова прыняць рад мер да паляпшэньня забясьпячэньня прамтаварамі сельскай гандлёвай сеткі. Абавязаць вышэйпаказаныя арганізацыі ў пяцідзённы тэрмін прадставіць у ЭКАСА канкрэтны плян арганізацыі гандлю на базарах і паляпшэньня снабжэньня прамтаварамі гандлёва - праводзячай сеткі вёскі з тым, каб канчаткова разгледзець гэтае пытаньне ў ЦК не пазьней 10 чэрвеня.

6. Прапанаваць Калгасцэнтру пад адказнасьць т. Міцькова зараз-жа даць канкрэтныя ўказаньні калгасам аб парадку арганізацыі імі гандлю. Сумесна з калгасамі і калгасьнікамі зараз-жа разгарнуць і правесьці мерапрыемствы па разгортваньні гандлёвай сеткі калгасаў з тым, каб да 1 ліпеня было адкрыта ня менш 40 калгасных магазынаў і 200 ларкоў. Калгасцэнтру ў прыватнасьці даць указаньні калгасам аб бесьперашкодным прадстаўленьні конай калгасьнікам для вываз кі імі сваёй прадукцыі на базары.

Абавязаць гарсаветы аказаць канкрэтную дапамогу ў падпуканьні і прадастаўленьні памяшканьняў для калгасных магазынаў.

7. Калгасцэнтру на працягу двух дэкад правесьці рад арганізацыйных мерапрыемстваў па забясьпячэньні кіраўніцтва разгортваньнем калгаснага гандлю, арганізаваць у апараце спэцыяльны сэктар па калгаснаму гандлі, правесьці нараду работнікаў райкалгассаюзаў па гандлі для практычнай прапрацоўкі пытаньня разгортваньня калгаснага гандлю, падабраць і падрыхтаваць з калгасьнікаў гандлёвых работнікаў для гандлёвай сеткі калгасаў.

8. Абавязаць т.т. Рачыцкага і Міцькова, шырока разгортваючы гандаль калгасаў і калгасьнікаў, арганізаваць адначасова гандлёвую сетку ў гарадох па лініі асобных саўгасных аб'яднаньняў і калгасных цэнтраў (Малакокалгасцэнтр, Сьвіраводкалгасцэнтр, Садгародкалгасцэнтр, Малакопрамтрэст, Садгародтрэст і інш.), не дапускаючы адміністрацыйнага прымацаваньня калгасаў да магазынаў калгасных аб'яднаньняў. Устанавіць, што дастаўка тавараў у гэтыя магазыны калгасамі праводзіцца на падставе добраахвотных узгадненьняў іх з магазынамі.

У пяцідзённы тэрмін прадставіць плян разгортваньня сеткі магазынаў па лініі калгасных цэнтраў і саўгасных аб'яднаньняў з тым, каб не пазьней 10 чэрвеня гэта пытаньне было разгледжана ў ЦК.

9. Абавязаць Белкаапсаюз прадставіць калгасам у часовае карыстаньне ларкі, палаткі, а таксама памяшканьні ў магазынах на базарах, якія знаходзяцца ў раёнах прамысловых прадпрыемстваў, для наладжаньня ў іх гандлю калгасамі сваёй прадукцыяй і арганізаваць дапамогу калгасам у прадастаўленьні ім памяшканьняў на складах і ледніках спажыўкаапэрацыі для захаваньня часткі сельска - гаспадарчай прадукцыі, якая застаецца нерэалізаванай.

10. Указаць усім каапэрацыйным арганізацыям на недапушчальнасьць падмены гарадзкімі і сельскімі спажыўтаварыствамі гандлю калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў, шляхам перакупкі ў іх прадуктаў і выступленьня замест іх на базарах.

Лічыць, што арганізацыя дэцэнтралізаваных загатовак каапэрацыйнымі арганізацыямі (ЗРК, ТСР, райсаюзамі, сталовымі, спэцыяльнымі загатоўчымі апаратамі спажыўкаапэрацыі) павінна праводзіцца галоўным чынам у глыбінных пунктах, на базарах сельскіх мясцовасьцяй і раённых цэнтраў, якія ня маюць прамысловага значэньня, а таксама ў раёнах, якія знаходзяцца ня ў зоне прамысловых цэнтраў.

Абавязаць тав. Хаскіна ў 3-хдзённы тэрмін вылучыць спэцыяльна члена прэзыдыуму Белкаапсаюзу, на якога ўскласьці арганізацыю і садзейнасьць разгортваньню калгаснага снабжэньня таварамі базараў і нагляд за паляпшэньнем становішча снабжэньня вёскі прамтаварамі.

11. Прапанаваць агітмасаваму аддзелу разам з Калгасцэнтрам і ЦСПСБ зараз-жа камандыраваць у раёны групу адказных работнікаў (25-30 чал.) для дапамогі на мясцох у справе арганізацыі калгаснага гандлю.

12. Абавязаць ГК і РК КП(б)Б у пяцідзённы тэрмін падабраць і накіраваць у райкалгассаюзы па адным работніку ў якасьці члена праўленьня выключна для калгаснага гандлю, забараніўшы скарыстаньне гэтых работнікаў для іншай работы.

13. ЦК указвае ўсім партыйным арганізацыям на неабходнасьць даваць рашучы адпор як праваапартуністычным скрыўленьням калгаснага гандлю, імкненьням разгарнуць яго за лік згортваньня выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай і разбазарваньня асноўнага капіталу калгасаў (продаж рабочай жывёлы, асноўнага стада таварных фэрм і г. д.), так і «лявацкім» мэтадам разгортваньня калгаснага гандлю — замены адміністрацыйным загадам арганізацыйна-масавай работы сярод калгасьнікаў вакол задачы разгортваньня калгаснага гандлю.

14. ГК і РК КП(б)Б пэрыядычна інфармаваць ЦК аб ходзе ўсёй работы па арганізацыі калгаснага гандлю.

Даручыць ЦКК РСІ ўстанавіць кантроль за выкананьнем гэтай пастановы і праз месяц далажыць ЦК КП(б)Б аб ходзе і выніках яе выкананьня.

15. Пастанову апублікаваць у друку.

Сьнеданьне ў дзіцячых яслях саўгаса «Івань» (Слуцкі раён).

Пра ход выкананьня веснавой сяўбы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Заслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Земляробства пра ход выкананьня веснавой сяўбы, Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што пры зусім нездавальняючым ходзе сяўбы па рэспубліцы ганебна адстаюць:

а) паўднёвая зона—Уваравіцкі, Нараўлянскі, Чачэрскі, Веткаўскі, Рэчыцкі, Камарынскі, Лоеўскі і Гомельскі раёны;

б) цэнтральная зона—Прапойскі, Бягомльскі, Чырвонапольскі, Талочынскі, Касьцюковіцкі і Смалявіцкі;

в) паўночная зона—Сураскі, Бешанковіцкі, Вушацкі і Віцебскі раёны.

Гэта тлумачыцца тым, што няма сыстэматычнага апэрацыйнага кіраўніцтва, няма правільнай расстаноўкі людзей і скарыстаньня трактарнай і конскай цягавай сілы і не праводзіцца масава-палітасьветная работа;

г) пры нездавальняючым ходзе выкананьня сяўбы ўсіх культур, асабліва мала ўвагі зьвяртаецца большасьцю раённых арганізацый на сяўбу асноўных культур: бульбы, ільну, канапель, сіласных культур і кармовых коранаплодаў.

Савет Народных Камісараў БССР лічыць неабходным асабліва адзначыць энэргічную работу жыткавіцкіх і чырвона-слабодзкіх партыйных і савецкіх арганізацый і Жыткавіцкай МТС, якія, дзякуючы мабілізацыі актыўнасьці і самадзейнасьці рабочых, калгасьнікаў і аднаасобнікаў, выканалі плян сяўбы ўсіх культур і Мсьціслаўскай і Лёзьнянскай маньчына-трактарных станцый, якія выканалі плян сяўбы ільну.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Цэнтральнай конкурснай камісіі на працягу аднаго дня ўнесьці прапановы аб парадку і разьмерах прэміі Жыткавіцкаму і Чырвона-Слабодзкаму раёнам і Жыткавіцкай машына-трактарнай станцыі за выкананьне пляну сяўбы і Лёзьнянскай і Мсьціслаўскай машына-трактарным станцыям за выкананьне пляну сяўбы ільну.

2. Абавязаць усе раённыя выканаўчыя камітэты, саўгастрэсты скончыць сяўбу ў бліжэйшыя дні, паставіўшы цэнтральнай задачай сяўбы тэхнічных культур (лён, канопля, бульба, кармовыя коранаплоды) і сіласных культур.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства ўсклясьці на аднаго з членаў Калегіі адказнасьць за штодзенны кантроль за ходам сяўбы ў саўгасах.

3. Абавязаць усе цэнтральныя і раённыя савецкія і грамадзкія арганізацыі забясьпечыць у бліжэйшыя дні такое кіраўніцтва веснавой пасеўнай кампаніяй, каб скончыць яе ў бліжэйшыя дні, бо толькі своечасовае выкананьне пляну сяўбы забясьпечыць і колькасьць і якасьць ураджаю.

4. У сувязі з тым, што ёсьць выпадкі скарыстаньня адпушчанага аўса на пасеў на іншыя патрэбы, катэгарычна папярэдзіць усе раённыя арганізацыі аб неабходнасьці безадкладнага скарыстаньня ўсяго адпушчанага насеньня ў парадку насеннай пазыкі.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР — А. КАЛНІН.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР — С. КАНДЫБОВІЧ.

4 чэрвеня 1932 г.

Пастанова Калегіі НКЗ і праўленьня Калгасцэнтру БССР аб разгортваньні калгаснага гандлю

У выкананьне пастановы СНК СССР, ЦК УсеКП(б) і КП(б)В, НКЗ і Калгасцэнтру СССР, Калегія НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру пастанаўляюць:

1. Абавязаць загадчыкаў райза і райкалгассаюзы:

а) На справе забясьпечыць сапраўднае растлумачэньне калгасьнікам паказанай вышэй пастановы партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю;

б) пры правядзеньні работы па растлумачэньні пастаноў аб калгасным гандлі, асабліва ўвагу зьвярнуць на арганізацыю ініцыятывы калгасьнікаў па пашырэньні плошчаў засеву бульбы, гародніны, збожжавых, крупяных, лепшы адкорм і нагул жывёлы, гадоўлю малад няка, птушкі, трусоў, павышэньне таварнага выхаду малака і г. д. для таго, каб забясьпечыць стварэньне ў кожным калгасе дадатковых таварных фондаў для разьвіцьця гандлю калгасаў і калгасьнікаў;

в) Да 10 чэрвеня разам з калгасамі і калгасьнікамі практычна прыступіць да разгортваньня іх гандлю, вызначыць колькасьць магазынаў, якія адкрываюцца, ларкоў, палаток і савецкіх базараў па кожным раёне. У паказаны вышэй тэрмін вызначыць у кожным калгасе адказных з ліку членаў праўленьня за арганізацыю гандлю.

Для правядзеньня арганізацыйнай работы ў калгасах па разгортваньні калгаснага гандлю, сумесна з раённымі гандлюючымі арганізацыямі мабілізаваць неабходную колькасьць работнікаў, замацаваўшы кожнага з мабілізаваных за пэўнай групай калгасаў;

г) увесьці ва ўсіх раёнах пасаду члена праўленьня калгассаюзу для работы выключна па арганізацыі калгаснага гандлю.

2) Прапанаваць праўленьням Сьвіраводсаюзу, Малакасаюзу і Садгародсаюзу і ўпаўнаважаным спэц. КЦ безадкладна прыступіць да разгортваньня ўласнай гандлёвай сеткі з тым, каб да 1 ліпеня было арганізавана па лініі:

Сьвіраводсаюзу—магазынаў—3, ларкоў — 180.

Малакасаюзу—магазынаў — 8, ларкоў — 225.

Садгародсаюзу—магазынаў — 17, ларкоў — 300.

Інкубат. КЦ — магазынаў —1

Трусавод. КЦ — магазынаў — 1.

Пчалавод КЦ — магазынаў — 1.

Магазыны адкрываюцца саюзамі і спэцыяльнымі калгаснымі цэнтрамі, а ларкі непасрэдна калгасамі.

Абавязаць т. т. Красоўскага, Грыневіча, Стырнэ, Паборцава, Макушына і Багушэўскага пры арганізацыі сваёй гандлёвай сеткі не дапускаць адміністрацыйнага прымацаваньня калгасаў і калгасьнікаў да магазынаў і ларкоў, якія арганізуюцца саюзамі, забясьпечыўшы выкананьне пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР ад 29 мая аб тым, што дастаўка тавараў калгасамі і калгасьнікамі ў гэтыя магазыны праводзіцца толькі на аснове добраахвотных згод іх з магазынамі.

3. Адкрыць апрача арганізуемых спэцыяльнымі саюзамі па лініі неспэцыялізаваных калгасаў, магазынаў — 16, ларкоў — 100.

4. Зьвярнуць асаблівую ўвагу праўленьняў калгасаў і калгасьнікаў на тое, што кулацкія і спэкуляцыйныя элемэнты будуць штурхаць іх пад відам гандлю на разбазарваньне асноўнага капіталу калгасаў (продаж рабочай жывёлы, асноўнага стада таварных фэрм, маемасьці і г. д.), а таксама на правядзеньне гандлю за кошт прадукцыі, якая падлягае здачы дзяржаве. Супроць падобных спроб трэба весьці рашучую барацьбу.

5. Для гандлёвай работы ў калгасах павінны быць вылучаны на 15/VI лепшыя калгасьнікі з вызваленьнем іх ад іншай работы. Ніякім чынам не дапускаць праязьдзіньня ў калгасны гандаль былых гандляроў, перакупшчыкаў, кулакоў, спэкулянтаў і асоб, якія дыскрэдытавалі сябе на каапэрацыйным і дзяржаўным гандлі.

6. У адпаведнасьці з пастановай НКЗ і Калгасцэнтру СССР абавязаць праўленьні калгасаў, сродкі, якія выручаюцца ад продажу калгаснай прадукцыі, пасьля выліку выдаткаў па гандлі і палаткаў з гандлёвага звароту, а таксама адлічэньняў у непадзельныя капіталы 10-15 %, выдаваць калгасьнікам у лік ужо выпрацаваных працадзён. Выдачу праводзіць ня менш аднаго разу ў месяц.

7. Аплата працы калгасьнікаў, занятых продажам калгаснай прадукцыі праз магазыны, ларкі і палаткі на савецкіх базарах устанаўляецца праўленьнямі калгасаў у залежнасьці ад колькасьці праданай прадукцыі і гандлёвага звароту; пры гэтым павінна быць улічана неабходнасьць зацікаўленасьці работнікаў калгаснага гандлю ў правільнай арганізацыі гэтай справы і ў павялічэньні аб'ёму прадаваемай прадукцыі.

8. Работа калгасных магазынаў, ларкоў, палаток і савецкіх базараў павінна быць пабудавана такім чынам, каб пры мінімальных гандлёвых выдатках яна садзейнічала прытоку неаграмаджанай часткі таварнай прадукцыі калгасьнікаў і прадукцыі працоўных аднаасобнікаў. Для гэтага праўленьні калгасаў павінны ўстанавіць мінімальную плату на пакрыцьцё выдаткаў па продажы (у магазыне, ларку, палатцы) прадукцыі калгасьнікаў і працоўнага аднаасобніка і забясьпечыць правядзень не неадкладнага разьліку за пастаўленую прадукцыю.

9. У мэтах устанаўленьня адказнасьці за захаваньне прадукцыі, якая накіроўваецца для продажу, праўленьне калгасу прызначае адказных асоб, якія абавязаны адаць яе па прызначэньні, а атрыманыя ад продажу грошы ў тойжа дзень адказнай за продаж асобе здаваць на спэцыяльны бягучы рахунак калгаску ў бліжэйшай апчадкасе, ці аддзяленьні Дзяржбанку.

10. Праўленьні калгасаў нясуць поўную адказнасьць за захаваньне пастановы ЦВК і СНК СССР ад 20 мая аб продажы калгаснай прадукцыі па цэнах, якія складаюцца на рынку. Для гэтага яны сумесна з рэвізійнымі камісіямі калгасаў устанаўляюць адпаведны пастаянны кантроль за работай магазынаў, ларкоў і палаток, а роўным чынам і за рэалізацыю калгаснай прадукцыі на савецкіх базарах.

11. Праўленьні калгасаў з самага пачатку павінны забясьпечыць правільны ўлік паступаючай для рэалізацыі калгаснай прадукцыі, фактычных сум, якія выручаюцца ад продажу, гандлёвых выдаткаў, адлічэньняў і выдач калгасьнікам грошай ад гандлю ў лік адпрацаваных працадзён.

12. Праўленьні калгасаў павінны адаць асабліва увагу правільнай арганізацыі работы на савецкіх базарах, у прыватнасьці:

а) шырока разгарнуць гандаль калгаснай прадукцыі на савецкіх базарах;

б) прадастаўляць для груп калгасьнікаў бяз усякіх затрымкаў транспарт, неабходны для падвозкі прадукцыі на базар;

в) разам з спажыўкаапэрацыяй садзейнічаць групам калгасьнікаў у прыстасаваньні спэцыяльных месц, ларкоў і палаток на базарах;

г) прадастаўляць калгасьнікам пазыўную ў калгасах свабодную тару для перакідкі іх прадукцыі;

д) праўленьні калгассаюзаў і ўпаўнаважаныя спэцыяльных калгасных цэнтраў і саюзаў павінны арганізаваць па савецкіх базарах спэцыяльныя кансультацыі праз сваіх інструктароў па пытаньнях гандлю калгасаў і калгасьнікаў.

13. Праўленьні калгасаў і калгасьнікі павінны мець на ўвазе, што работа па разгортваньні гандлю калгасаў і калгасьнікаў павінна праводзіцца пад знакам паказьненьня якасных паказальнікаў іх выпэрчай работы, павялічэньня таварнай прадукцыі і барацьбы з кулацтвам, спэкулянтамі і перакупшчыкамі, якія прабуюць нажыцца на калгасным гандлі.

14. Для кіраўніцтва калгасным гандлем арганізаваць у апараце Калгасцэнтру самастойны сэктар са штатам у 8 адзінак.

Абавязаць старшынь спэцыяльных саюзаў і ўпаўнаважаных цэнтраў у трохдзённы тэрмін увесьці пасаду і ўкамплектаваць работнікамі, адказных выканаўцаў па гандлі.

15. Пункт 4 інструкцыі Калгасцэнтру аб разгортваньні калгаснага гандлю ў частцы цэн на прадукцыю, якая прадаецца па калгасамі звыш пазіцыі цэнтралізаваных загатовак, адхіліць.

НАМ. НАРКАМЗЕМУ — МАСЮКОЎ.
СТАРШЫНЯ ПРАЎЛЕНЬНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР — МІЦЬКОЎ.

3 чэрвеня, 1932 г.

Ільнатрасту выкарыстоўваюць на подсьціл

БЯЛЫНІЧЫ.

Бялыніцкі раён ганебна адстае ў выкананьні пляну ільна і пеньказагатовак. Плян па раёне рэалізован на 54 проц. Калгасны сэктар здаў 64,9 проц., аднаасобны сэктар—39 проц., па цьвёрдых заданьнях паступіла 34,5 проц.

Чым тлумачыцца такое становішча? У першую чаргу, апартуністычнымі адносінамі да ільназагатовак з боку старшыні РВК тав. **Пастынкевіча**, а таксама райснабу і райза. Тав. **Пастынкевіч** лічыць, што «загатовіць на ўсе 100 проц. немагчыма». Паводле думкі-ж райснабу і райза «ў аднаасобніка ільну няма».

У той-жа час выяўлен рад фактаў, калі лён у некаторых калгасах выкарыстоўваецца на вяроўкі і нават на подсьціл дарогі. Калгас імя Калініна выслаў дарогу трастой. Ёсьць факты, калі самыя лепшыя нумары ільнавалакна папалі ў рукі прыватнікаў-спэкулянтаў, якія плацілі па рублю за кілёграм.

Прэміяльны і хлебны фонд, вызначаны для стымуляваньня ільназагатовак, разбазарваецца. Да гэтага часу многія ўдарнікі ільназагатовак не атрымалі ад райспажыўсаюзу прэміі. РВК на гэтыя факты не рэагуе. Загадчык Райзагатільну толькі 27 мая даведаўся аб тым, што вызначаны збожжавы фонд для снабжэньня ільназдатчыкаў. Калі-ж навялі спраўку ў райснабе, дык аказалася, што з гэтага фонду 80 тон даўно атрымана і раздана райспажыўсаюзам у часе правядзеньня ім загатовак. Куды дзелася рэшта збожжа—невядома. Ёсьць выпадкі, калі некаторым ільназдатчыкам нават ня выплачаны яшчэ грошы.

Ня дзіва, што пры такіх умовах тэмпы ільназагатовак праходзяць вельмі нездавальняюча. Да гэтага часу ня ма ўліку наяўнасьці ільнасаломы, трасты і гатовай прадукцыі. Тройка па арганізавана.

Неабходна ўдарыць па апартуністычных і дэмабілізацыйных настроях у ільназагатоўках, ліквідаваць самацёк, выявіць наяўнасьць ільнавалакна, трасты і саломы, арганізаваць іх пераапрацоўку і здачу на загатпункты. Трэба прыцягнуць да адказнасьці винаватых у разбазарваньні фондаў, прызначаных для стымуляваньня ільназагатовак.

А. Дзісьнэр.

Ф. ГОЛЬДМАН

Вайсковай рабоце камсамолу—бальшавіцкія тэмпы і якасьць

Мы знаходзімся ў паласе разгорнутай падрыхтоўкі да VII усесаюзнай канфэрэнцыі і VI пленуму ЦК ЛКСМБ.

Ленінскі камсамол Саюзу і яго атрад — ЛКСМБ разгортваюць вялікую работу па сустрэчы VII усесаюзнай і пленуму ЦК новымі перамогамі на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Усесаюзная канфэрэнцыя і пленум ЦК будуць праходзіць пасьля абмену камсамольскіх білетаў, які прайшоў пры новым уздыме актыўнасьці камсамолу ў барацьбе за выкананьне плянаў гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Атрыманьне новага камсамольскага білету — пуцёўкі на барацьбу за генэральную лінію партыі — дзесяткі і сотні тысяч рабочай і калгаснай моладзі, што знаходзіцца ў КСМ, адзначылі хвалай спраў, зьвязаных з узмацненьнем ахопу камсамольцаў і беспартыйнай моладзі ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам, пераводам камсамольска - маладзёжных брыгад на гаспадарчы разрахунак, з уводам у сыстэму іх работы зьменна-сустрэчнага плянаваньня, шырокай работай па стварэньні пастаянных калгасных брыгад, брыгад «ДІП», павышэньнем марксыцка-ленінскага выхаваньня.

Значнае месца пры абмене камсамольскага білету займала пытаньне валянізацыі камсамолу, на аснове пастаноў IX зьезду УсеЛКСМ. Рад камсамольскіх арганізацый на гэтым адказьнейшым вучастку дасягнуў значных посьпехаў. Так, па Полацкай арганізацыі КСМ, дзякуючы шырокаразгорнутай масавай рабоце, былі адкрыты новыя навучальныя пункты, арганізаваны навучальна - страявыя адзінкі, забясьпечан карэнны зрух у справе ахопу камсамольцаў вайсковым навучаньнем. **Да ліку перадавых арганізацый можна аднесьці Пятрыкоўскую** (з 936 камсамольцаў ахоплены вайсковым навучаньнем — 782 чал.), **Чашніцкую** (з 986 ахоплена—937), **Вушацкую** (з 1.008 ахоплена 706) і г. д. Рад арганізацый маюць ня дрэнныя пачынаньні ў справе разгортваньня ваеннай масавай работы сярод працоўнага насельніцтва і арганізацыі руху за аўладаньне вайсковай тэхнікай.

Аднак, адзначаючы гэтыя асобныя посьпехі, было-б надзвычайна шкодна на іх супакоіцца. Тым больш, што мы знаходзімся ў прымежнай паласе і адсюль патрабаваньні перад КСМ, як і перад абарончымі арганізацыямі (АСО, Чырвоны Крыж), зьяўляюцца выключна адказнымі. Гэтыя абставіны, «абставіны работы на важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ад камсамольскага кіраўніцтва асаблівай увагі да задачы ўзмацненьня вайсковай работы ў камсамоле і ацэнка кіраўніцтва, пачынаючы ад ячэйкі і канчаючы ЦК, будзе па тым, наколькі будзе забясьпечана расстаноўка сіл, уплыў камсамолу, самаадданасьць камсамольцаў на мяжы, выхаваньне дзесяткаў тысяч камсамольцаў - чэкістаў, падрыхтоўка лепшых стралкоў, снайпэраў, ператварэньне кожнага прадпрыемства ў крэпасьць абароны». (Герцовіч).

Так ставіць пытаньне ЦК ЛКСМБ. Такавы адзін з важнейшых крытэрыяў для ацэнкі баяздольнасьці кожнай камсамольскай ячэйкі для праверкі таго, наколькі кіраўніцтва тэй ці іншай арганізацыі стаіць на ўзроўні пастаўленых перад ёй задач.

Супакойвацца на тым, што намі дасягнута ніяк нельга. Да справы трэба падыходзіць толькі з пункту погляду **павышаных патрабаваньняў** і тых адказных задач, якія мы павінны яшчэ вырашыць.

IX зьезд УсеЛКСМ прызнаў «разьмер і зьмест вайсковай работы ў КСМ не адпавядаючымі сучасным патрабаваньням абароны краіны і новаму тэхнічнаму ўзбраеньню РСЧА» і патрабаваў **«безадкладнага ажыцьцяўленьня задачы ўсеагульнага абавязковага навучаньня камсамольцаў, асваеньня кожным камсамольцам мінімуму агульных і аднаго з відаў спэцыяльных, галоўным чынам, тэхнічных вайсковых ведаў».**

Гэта дырэктыва зьезду радам беларускіх арганізацый КСМ выконвасьцца слаба, а часткаю **зусім ня выконваецца.** І што асабліва дрэнна, да ліку слаба выконваючых гэту выключна важную задачу адносяцца буйнейшыя камсамольскія арганізацыі, як Менская, Віцебская, Гомельская, Магілеўская і рад іншых раёнаў.

Дзе-ж прычыны ганебнага адставаньня многіх камсамольскіх арганізацый у справе вайсковай падрыхтоўкі? Аднэй з прычын зьяўляецца тое, што **зусім невыстарчальна разгорнута масава - растлумачальная работа, не даведзена да шырокай камсамольскай масы, асабліва да навічкоў, адно з важнейшых указаньняў IX зьезду УсеЛКСМ аб тым, што: «у радох КСМ не павінна быць месца тым, хто недацэньвае неабходнасьці вайсковай падрыхтоўкі і тым, хто не праводзіць штодня вайсковай работы».**

На вайсковых заняткох.

Каб давесьці гэту дырэктыву зьезду да найшырэйшых мас, неабходна скарыстаць усе формы масавай работы (зьлёты ўдарнікаў адзоны, страляковыя канфэрэнцыі, мітынгі - перакліч кі, фота-вітрыны, друк і г. д.), падпарадкаваўшы гэту справу асноўнай задачы — забясьпячэньню **поўнага ахопу камсамольцаў абавязковым вайсковым навучаньнем** (узростаў 1910—1914 г. г. і астатніх узростаў) і барацьбе за **якасныя** паказальнікі вайсковага навучаньня.

Наступным істотным недахопам зьяўляецца тое, што зараз **устаноўленыя арганізацыйныя формы вайсковага навучаньня часта яўна скажаюцца, а месцамі проста сарваны.** У выніку — работа «па-старыцы», гурткоўшчына, адсутнасьць выразнасьці і пасьлядоўнасьці ў арганізацыі сыстэмы вайсковага навучаньня. Гэта цягне за сабой размагнэсанасьць, зьніжэньне зацікаўленасьці камсамольцаў да заняткаў, а значыцца, і непасрэдна пагаршае вучобу.

Адна з асноўных станоўчых, праверэных на практыцы форм вайсковага навучаньня — **вучэбныя пункты** — радам арганізацый Асоавіяхіму і камсамолу літаральна скажаецца (Менск, Гомель, Мазыр). Правільнай арганізацыі работы на вайсковым пункце часам не разумеюць ня толькі тыя, якія займаюцца, але нават і кіруючы склад. Часта разумеюць пад вучпунктам звычайны клюб, куды прымацаваны 3-4 узводы, пасаджаны нач. вуч. пункту, які вылучае інструктароў для заняткаў на завод. Гэта ня вучпункт, а дапаможная база, дзе хаваецца зброя. (І, на жаль, не заўсёды так, як сьлед). Гэта пабудова нічога агульнага ня мае з сапраўднай сыстэмай работы вучпункту, які павінен быць адпаведным чынам абсталяваны, дзе сканцэнтравана матар'яльная база, камандны склад, праведзена разьбіўка на вучэбна - страявыя падразьдзяленьні. Да пункту трэба прымацаваць ячэйкі ЛКСМБ і Асоавіяхіму, якія-б штодзенна наглядалі за паведваньнем і якасьцю вайсковага навучаньня. Камплектаваньне вучпунктаў неабходна арганізаваць так, каб тыя, што займаюцца, папярэдня прайшлі мэдычны агляд.

Паласа падрыхтоўкі да VII Усесаюзнай павінна прайсьці пад знакам перабудовы мэтадаў вайсковага навучаньня камсамолу з тым, каб цэнтр вайсковага навучаньня быў перанесен на вучпункт.

Арганізацыі КСМ і Асоавіяхіму абавязаны сапраўды павярнуцца ў бок ня толькі штодзеннага кантролю над ахопам камсамольцаў, але, галоўным чынам, змагацца за **высокую якасьць вайсковага навучаньня і падрыхтоўкі з камсамольцаў вайсковых спэцыялістаў** (танкістаў, артылерыстаў, сувязістаў, плянэрыстаў), разгортваючы далейшы паход за падрыхтоўку клясных стралкоў, працягваючы і надалей правядзеньне стралковага конкурсу-паходу камсамолу.

Наша задача — у найкарацейшы тэрмін у сыстэме вайсковага навучаньня **падрыхтаваць усю камсамольскую масу на здачу нормы кляснага стралка.** Дабіцца гэтага — справа гонару кожнай камсамольскай і асоавіяхімаўскай арганізацыі.

У сыстэме вайсковай работы камсамолу значнае месца павінна заняць пытаньне наладжаньня **супольнай работы камсамолу з абарончымі арганізацыямі** (Асоавіяхім, Аўтадор, Чырвоны Крыж), якія патрабуюць ад камсамолу значнай дапамогі па лініі высоўваньня кіруючых кадраў на ўсіх вучастках работы зьверху да нізу, павялічэньня ўвагі да нізавых зьвеньняў — ячэек.

Зусім нязначны ахоп камсамольцаў абарончымі арганізацыямі (Асоавіяхім — 41 проц.) патрабуе ад апошніх шырокай работы па ўцягненьні ў члены гэтых таварыстваў. Адначасова трэба рашуча павысіць удзел КСМ у практычнай рабоце абарончых арганізацый у разгортваньні тут бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

**

ЗА МЯЖОЙ

У падвалах Лукіскай турмы павешан батрак Малько

Ваенна-палявымі судамі і шыбеніцамі польскі фашызм імкнецца задушыць рэвалюцыйна-вызваленчую барацьбу працоўных Зах. Беларусі

Уздым рэвалюцыйнага руху працоўных мас польскі фашызм імкнецца задушыць лесам шыбеніц. Зарэз няма таго дня, каб фашысцкая прэса не паведамляла аб адданьні ваенна-палявому суду рэвалюцыйных рабочых і сялян у тым ці іншым горадзе Польшчы. **Асабліва гуляюць ваенна палявыя суды на акупаваных Зах. Беларусі, Зах. Украіне.** Каб замаскаваць перад шырокай грамадзкай думкай прычыны сваёй крывавай расправы над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі, акупанты карыстаюцца модным зараз у Польшчы абвінавачаньнем у «шпіянажы» на карысьць СССР.

Гэтымі днямі, як падае манархічная віленскае «Слово», **у Вільні** адбыліся два ваенна-палявыя суды над батраком з фальварку Балявіна, Мядзёльскай воласьці — **Андрэем Малько і Юльянам Каланта і Пятрэм Чапулісам** — сялянамі-бедняками Віленска-Троцкага павету, на абвінавачаньні ў «шпіянажы».

Андрэй Малько засуджан да пакараньня сьмерцю праз павешаньне. Як паведамляе газэта, **прыгавор прыведзен у выкананьне 3 чэрвеня** галоўным катам Маціеўскім у **падвале першага павільёну Лукіскай турмы.**

Нават фашысцкая прэса са сьціснутымі зубамі прымушана прызнаць героўскае захаваньне засуджанага па сьмерць Малько. Напа, які зьвярнуўся да яго перад сьмерцю з напутственным словам, ён прагнаў воп. Каб ўладзіць тое ўражаньне, якое зрабіла гэта геройская сьмерць рэвалюцыйнага батрака пават на турэмных катаў, орган крэсавых зубраў «Слово» з цынізмам тут-жа пасьля выкананьня прыгавору падае гутарку з галоўным катам Маціеўскім. «Экзэкуцыя (г. зн. вешаньне) скончана. Прозьвішча Маціеўскі — шырока вядомае і папулярнае. Маціеўскі — маэстра (вялікі майстар сваёй справы) у старапольскім значэньні гэтага слова».

Далей орган манархістаў з захапленьнем апісвае знадворны выгляд ката: «малады чалавек, сярэдняга росту, з прыемнаю ўсьмешкаю на твары. Дасканала пашыты ясны гарнітур, элегантні капялюш, у руках скураны партфэль. Ніхто не падумаў-бы, што гэта рука ў модных рукавічках толькі некалькі мінут назад...». Але відаць пават у пеўца ката не хапіла далей мужнасьці паўтарыць тое, што робіць фашысцкая ўлада кожны дзень над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі.

Пралетарыят Польшчы не забудзе ні аднэй ахвяры, загінуўшай ад рук фашысцкіх катаў за лепшую будучыню ўсіх працоўных.

Масавае ўцяканьне сялян у СССР

ВАРШАВА, 2. «Ілюстраваны Кур'ер Подзенны» паведамляе, што за апошні час сталі больш частымі спробы масавага ўцяканьня польскіх сялян у СССР. Так, у раёне пагранічнага вучастку Сухадоўшчына была затрымана група сялян, якія прабавалі прабрацца ў СССР. На пагранічным вучастку Вілейка была затрымана пры спробе перайсьці мяжу група сялян **з 12 чал.**

Статыстыка крывавага тэрору

26 ПАВЕШАНЫХ У ВІЛЬНІ

ВІЛЬНЯ, 4. Адначасова другая фашысцкая газэта **«Дзеньнік Віленскі»** ў № 123 ад 2 чэрвеня падае афіцыяльныя даныя Галоўнай Статыстычнай Управы аб колькасьці асоб, якія былі адданы пад ваенна-палявыя суды ў мінулым годзе. Паводле гэтых даных з моманту ўвядзеньня ў Польшчы ваенна-палявых судоў, г. зн. з верасьня 1931 г. па студзень 1932 г. ва ўсёй Польшчы аддана было пад ваенна-палявыя суды **66 чал.**, з якіх толькі адзін быў апраўдан, а справа 13 чал. была перадана ў акруговы суд. З 52 засуджаных **39 прыгавораны да кары сьмерцю.**

Найбольш ваенна-палявых судоў адбылося **ў Вільні і Львове** (26 у першым і 20—у другім), г. зн. дзе адбываецца зацятая барацьба працоўных мас супроць улады акупантаў. У **Варшаве адбылося 7 ваенна-палявых судоў, у Пазнані—5, Любліне—4, Торне—3 і 1 у Кракаве.**

Катаржныя прысуды ў Горадні

ВАРШАВА. Акруговы суд у Горадні вынес прыгавор па справе **11 асоб, якія абвінавачваліся ў камуністычнай дзейнасьці. 9 падсудных прыгавораны** да розных тэрмінаў катаржнай турмы **ад 6 да 1 году.**

Петракоўскі акруговы суд прыгаварыў да аднаго году катаржнай турмы **Яковако,** арыштаванага ў часе разьвешваньня камуністычнага плякату на тэлеграфных слупох.

Разгром прафсаюзу рабочых-трыкатажнікаў

ВАРШАВА, 4. Як паведамляюць газэты ў Берасьці Куяўскім (Варшаўскае ваяводзтва) паліцыя арыштавала 10 чал. — членаў ваеннай арганізацыі («Стралец») **па абвінавачваньні ў камуністычнай дзейнасьці. У Дамброве Гурнічай** (Дуброўскі басэйн) гэтымі днямі арыштавана 4 рабочых і студэнты. Усе яны абвінавачваюцца ў тым, што арганізавалі камуністычны мітынг. У **Варшаве** палітычная паліцыя зрабіла вобыск у будынку прафсаюзу рабочых-трыкатажнікаў. **Усе члены прафсаюзу, якія знаходзіліся ў будынку, былі арыштаваны, а сам прафсаюз распушчан за «тэрарыстычную дзейнасьць».**

Генэрал Мільлер заклікае белагвардзейцаў да дзеяньня

Сакрэтны цыркуляр „агульнавайсковага саюзу"

ПРАГА, 2. Як вядома, камфракцыя чэха-славацкага парляманту ўнесла ў свой час інтэрпэляцыю, у якой выкрывала тэрарыстычныя падрыхтаваньні праскага аддзяленьня белагвардзейскага «АГУЛЬНА-ВАЙСКОВАГА САЮЗУ».

На гэту інтэрпэляцыю чэха-славацкі ўрад адказаў катэгарычнай заявай, што ў дзейнасьці данай арганізацыі «НЯМА НІЧОГА ПРАДАСУДЖАЛЬНАГА». Напамінаючы аб гэтай заяве, орган чэха-славацкай кампартыі «Рудэ права» публікуе наступны цыркуляр, адрасаваны старшыням «агульнавайсковага саюзу».

«ПАРЫЖ, 15 красавіка 1932 году № 276.

Міласьцівы гасудар, з мэтай растлумачэньня далёка-ўсходніх падзей і іх вынікаў для рускіх нацыянальных інтарэсаў, я лічу неабходным паведаміць вам наступныя асноўныя тэзісы, з якімі вы павінны азнаёміць падпарадкаваныя вам органы:

1) Унутрыпалітычнае становішча ў Савецкім саюзе не дапускае надзей на зьвяржэньне савецкага ўраду ўнутранымі сіламі без штуршка звонку. 2) Ні адна з суседніх дзяржаў ня выступіць супроць СССР толькі для таго, каб скінуць савецкі лад, калі не адбудуцца асаблівыя сусьветныя падзеі. 3) Савецкі ўрад, які ў якасьці выканаўчага органу Камінтэрну прапагандуе камунізм у Японіі і Кітаі, зьяўляецца абсалютным ворагам Японіі, што поўнасьцю разумеюць далёкабачныя японскія дзяржаўныя дзеячы. 4) Выконваючы сваю нацыянальную задачу, Японія няміну ча павінна прыйсьці да сутычак з Савецкім саюзам. 5) У гэтым выпадку Японія будзе змагацца як супроць камізму (тут нашы інтарэсы супадаюць), так і за свае ўласныя інтарэсы, якія разьхсдзяцца з нашымі.

Выходзячы з гэтых асноўных тэзісаў, мы павінны акрэсьліць нашу лінію. Было-б злачынствам сядзець, чакаць і спадзявацца на бога. Мы павінны шукаць выхаду, прэбуючы дасягнуць згоды з Японіяй на базе супаданьня інтарэсаў Японіі і нашых. Пры гэтым трэба прыняць пад увагу наступныя моманты: 1) Шырокія рускія апэрацыі, накіраваныя на зьвяржэньне савецкага ўраду, намысьлімы на далёкім Усходзе, без згоды з Японіяй. 2) Без такой згоды будуць пастаўлены пад пагрозу з боку Японіі рускія далёка-ўсходнія інтарэсы. Непьга спрачацца з тым, што Расія рызыкуе страціць сваю ціха-акіянскую тэрыторыю. Гэта рызыка можа быць зьменшана толькі папярэдняю згодаю з Японіяй. Японія выступіць супроць СССР і без згоды з рускімі нацыяналістамі, калі яна знойдзе гэта мэтазгодным. Калі мы жадаем такой згоды і самастойных апэрацый на далёкім Усходзе, дык МЫ ПАВІННЫ ПА МАГЧЫМАСЬЦІ ПАВЫСІЦЬ НАШУ ВАРТАСЬЦЬ У ВАЧОХ ЯПОНЦАЎ, ТАМУ НЕАБХОДНА ЗГУРТАВАЦЬ НАШУ ВАЕННУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ І ЎСЕБАКОВА ПАДРЫХТАВАЦЬ ЯЕ ДЛЯ ПАДТРЫМАНЬНЯ МАГЧЫМЫХ ПАЎСТАНЬНЯЎ УНУТРЫ СССР.

Далей, з мэтай забясьпечыць аднадушнае выступленьне, неабходна перамагчы распыленасьць ўнутры эміграцыі. Пратэрмінаваньне ў гэты гістарычны момант было-б роўназначна здрадзе. Калі-б Японія вырашыла далёка-ўсходнюю праблему бяз нас, дык стварылася-б небясьпека, што нашы далёка-ўсходнія ваенныя сілы ня знойдуць сабе прыстасаваньня.

ГЕНЭРАЛ МІЛЬЛЕР».

Гэты дакумент «Рудэ право» суправаджае наступнымі камэнтарэмі: «Чэха-славацкая буржуазія з адкрытымі абдымкамі прытуліла гэтых белабандытаў. На зьлёце сокалаў (буржуазная ваенная арганізацыя) яны зьбіраюцца прымаць удзел у парадзе па вуліцах Прагі. Чэха-славацкі прапетарыят ня можа дапусьціць такой правакацыі. Яшчэ мацней павінна прагучэць патрабаваньне: «ВОН АДГЭТУЛЬ БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІЯ БАНДЫ».

Урад міліянэраў выконвае патрабаваньні фашыстаў

БЭРЛІН, 4. Камэнтуючы роспуск рэйхстагу новым германскім урадам, **«Ротэ Фанэ»,** піша: «Гэтым урад міліянэраў выканаў першае з двух патрабаваньняў нацыянал-сацыялістаў. Другое патрабаваньне аб адмене забароны штурмавых атрадаў таксама будзе выканана. Фашысцкі лідэр Бэрынг, ужо ўчора ўрачыста заявіў: «Яшчэ некалькі дзён і штурмовыя атрады апрашаюць карычневую форму». Гітлераўскія гвалтоўнікі будуць пацкаваны на рабочых для таго, каб тэрорам дабіцца большасьці ў новым рэйхстагу. Паміж Гітлерам і Шлейфэрам ужо дасягнута цьвёрдая згода, што пацьвярджаецца і органам каталіцкіх прафсаюзаў. Сацыялісты абавязуюцца абараняць урад магнатаў і хэмічных каралёў супроць наступленьня рабочых».

Сялянскае паўстаньне у Юга-Славіі разгараецца

Паўстаўшыя раззбройваюць жандармэрыю і грамяць харчовыя крамы

БЭРЛІН, 2. Паводле вестак эўрапэйскага сялянскага камітэту, **сялянскія хваляваньні ўзмацняюцца па ўсёй Юга-Славіі, асабліва ў Босьніі, Герцагавіне і Македоніі.** У многіх мясцох паўстаўшыя сяляне раззброілі жандармэрыю і разграмілі харчовыя крамы. У радзе мясцовасьцяй уведзен стан аблогі.

У Харватыі таксама выбухнулі сялянскія хваляваньні. Сяляне патрабуюць вызваленьня Харватыі з-пад вялікасэрбскага ярма. У вёсцы **Бугойна** (Босьнія) больш 3.000 паўстаўшых сялян паладзілі дэманстрацыю, падпалілі сьвірны са збожжам у **Банялуку** і каталіцкі манастыр. **Жандармэрыі толькі пасьля жорсткіх крывавых баёў удалося разагнаць паўстаўшых сялян.** У акругах Імлцкі, Сінь-Метоквіцы, Берковіцы і інш. адбыліся буйныя дэманстрацыі сялян, якія патрабавалі выдачы насельня. Ва ўсе гэтыя акругі паслана войска.

У горадзе **Чачак** (Старая Сэрбія) некалькі соцень сялян **напалі на жандарскую ўправу.** Забіты 3 жандары. **У вёску накіравана карная экспэдыцыя для расправы з сялянамі.** Некалькі соцень узброеных сялян уцякілі ў лясы.

СТВОРАН ШТАБ ДЛЯ КІРАЎНІЦТВА МЕСЯЧНІКАМ ЛЕСАЗАГАТОВАК і ВЫВАЗКІ

Пастанова СНК БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Для кіраўніцтва і нагляду за ходам месячніка лесазагатовак і лесавывазкі, абвешчанага пастановай ЭКАСА ад 22 мая 1932 г. (газэта «Савецкая Беларусь» № 116, ад 28/V-32 г.) стварыць пры СНК БССР штаб у складзе т. т. БЭНЗКА (старшыня), РОЗІНА (нам. старшыні), БАСКІНА, ШАПІРА, МІРУЦА, ШЫЦЬКО, СОСІНА, СЬВЯРДЛОВАЙ і прадстаўнікоў ад ЦК ЛКСМБ і рэдакцый газэт: «Зьвязда», «Савецкая Беларусь» і «Рабочий».

2. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам на працягу пяці дзён арганізаваць такія штабы ў кожным раёне і сельскіх саветах.

Нам. старшыні СНК БССР—КАЛНІН
Кіраўнік спраў — КАНДЫБОВІЧ
4 чэрвеня 1932 г.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Новая магутная база высокаякасных сталяй

РАСТОЎ-НА-ДАНУ. На домне № 2 Сулінскага мэталюргічнага заводу закончана вопытная плаўка малкінскай (Кабардзіна-Баркарская аўтаномная вобласьць) жалезнай хрома-нікелевай руды. Атрымана 90 тон перадзельнага чыгуну з наяўнасьцю нікелю—0,6 проц., хрому—3 проц., серкі — 0,061 проц., фосфару—0,252 проц. **Аналіз гаворыць аб выключнай чыстаце і высокай якасьці чыгуну,** прычым доменны працэс праходзіў значна лепш і ў больш кароткія тэрміны, чым пры выкарыстоўваньні крывароскай руды, на якой працуе завод.

31 мая на тым-жа заводзе распачата мартэнаўская варка сталі выключна з чыгуну малкінскіх руд, якая дала на працягу 6 гадзін 45 мінут (пры мартэнаўскім працэсе на крывароскім чыгуне і ломе—10-12 гадзін) высокаякасную хрома-нікелевую сталь для адказнейшага машына будаўніцтва (аўтатрактарнага, варштатабудаўніцтва і інш.).

Пробны пракат сталі на Сулінскім заводзе 1 чэрвеня даў таксама зусім станоўчыя рэзультаты. Такім чынам, **высокая якасьць хрома-нікелевых малкінскіх руд цьвёрда ўстаноўлена ва ўсіх мэталюргічных працэсах.**

Выкананьне прамфінпляну заводам „Камунар" за май

Машынабудаўнічы завод «Камунар» выпусьціў у маі 180 варштатаў Сьмірнова--72 проц. месячнага заданьня; 26 камнядрабілак—104 проц.; 27 кувырак—16,8 проц.; 129 скатаў—184,3 проц.; 21 солададрабілку—140,5 проц.; 71 тачыльны варштат—94,6 проц.; 2.121 шт. розных цісковаў—51,9 проц.; розных рамонтных заказаў на 81.337 руб.—164,5 % бляшаны цэх даў прадукцыі на 34.976 руб.—59,3 проц. і на 2.700 руб. выпушчана рознага чыгуннага ліцьця.

Усяго выпушчана прадукцыі на 322.306 руб., што складае 76,4 проц. месячнага пляну.

Вынікі работы заводу „Чырвоны мэталіст"

Віцебскі завод «Чырвоны мэталіст» выканаў прамфінплян за май месяц на 87,7 проц. Выпушчана прадукцыі на 335.535 руб.

Выпушчана 531 карнізрэзка, што складае 106,2 проц. месячнага заданьня, 404 жмыхадрабілкі—101 проц., 40 аднакорпусных плугоў—100 проц., 458 бульбакапальнікаў—65,4 проц., 9 лябёдак, розных запасных частак—на 1.326 руб.—13,2 проц.

На 1-й БелДРЭС

31 мая на 1-ай БелДРЭС выпрацавана 152.000 клвт.-гадзін электраэнэргіі, што складае 84 проц. заданьня. Максымум дасягнуў 8.000 клвт., мінімум—5.000 клвт., сярэдняе—6.333 клвт.

1 чэрвеня выпрацавана 153.000 клвт.-гадзін. Максымум дасягнуў 8.000 клвт., мінімум—5.200 клвт., сярэдняе—6.375 клвт.

Расгрузак 31 мая і 1 чэрвеня ня было.

Будматар'ялы

Лесазавод «Спартак» 29 мая выканаў прамфінплян на 111 проц. (расьпілавана 89 кбм. сырцу), **а 30 мая—на 132 проц.** (расьпілавана 106 кбм.). Прамфінплян за май заводам выкананы на 105 проц.

***

324 ком. сырцу (88 проц. заданьня) расьпілавана на дрэваапрацоўчым камбінаце **«Камінтэрн»** 1 і 2 чэрвеня.

Папера

На Добрускай папяровай фабрыцы «Герой працы» за 29 і 30 мая выраблена 121,4 тоны паперы, што складае 74,8 проц. заданьня, 15 тон саломенай цэлюлёзы—62,5 проц. і 10 тон дрэўмасы—56 проц. Прастой машын—91 гадзіна, замест 18 паводле пляну.

***

10 тон паперы (61,2 проц. пляну) выпусьціла папяровая фабрыка «Спартак» 31 мая.

***

Папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» 1 чэрвеня выпусьціла 17 тон паперы—42,6 проц. заданьня.

Вопратка

Швэйная фабрыка «Камінтэрн» за 6 пяцідзённку мая выканала прамфінплян на 116,3 проц. Выпушчана прадукцыі на 326 тысяч руб.

Скура

Чырвонасьцяжная гарбарня «Бальшавік» выпусьціла прадукцыі за 6 пяцідзённку мая на 969.139 руб. Прамфінплян выканан на 100,7 проц.

Рапартаваць аб поўным выкананьні фінпляну

НКФ БССР, за подпісам т. ЛЯХАВА, разаслаў наступную тэлеграму ўсім райкомам і райфа: «У бліжэйшыя дні чакаецца прыезд у БССР наркома фінансаў Саюзу ССР тав. Грынько.

Просьба прыняць тэрміновыя захады для забесьпячэньня рапарту наркому аб датэрміновым выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў па ўсіх плацяжох».

ПАПРАЎКА

У артыкуле М. І. Калініна «Аб савецкім гандлі», зьмешчаным ва ўчарашнім нумары «Зьвязды», у 4 калёнцы 34 радку зьверху на віне рэдакцыі дапушчана скажэньне.

Напісана: «Ні ў якім выпадку капэрацыя не павінна скупляць прадукты на рынку і павышаць цэны».

Трэба чытаць: «Але ні ў якім выпадку не павінны садзейнічаць павышэньню цэн на рынку».

Заўтра, 7/VI ў 9 гадзін раніцы, у памяшканьні рэдакцыі газэты «Зьвязда» (Савецкая, 63, трэці паверх, габінэт рэдактара) адбудзецца пасяджэньне **цэнтральнага кармовага штабу** па пытаньнях правядзеньня **сенаўборкі.**

На пасяджэньне з адпаведнымі матар'яламі ў абавязковым парадку павінны зьявіцца прадстаўнікі: Наркамзему, Калгасцэнтру, Малакакалгассаюзу, Сьвінаводкалгассаюзу, Лугавога трэсту, Малакапрамтрэсту, трэсту Сьвінавод, Насентрэсту, Белтушкатрусаводтрэсту, Садгародтрэсту, Сельгасабъяднаньняў Белкаапсаюзу, ЦП саюзу жывёлагадоўчых рабочых, ЦК ЛКСМБ.

«ЗЬВЯЗДА».
ЦКК НК РСІ.

8 чэрвеня а 7 гадз. увечары ў памяшканьні рэдакцыі газэты **«Зьвязда»** (Савецкая, 63, 3-ці паверх) адбудзецца пасяджэньне.

Камісіі садзейнасьці камунальнаму будаўніцтву

На парадку дня інфармацыя кіраўніка Менбуду тав. АНДРЭЕВА аб жыльлёвым будаўніцтве (пад кутом выкананьня пастановы сакратарыяту гарвыканкому КП(б)Б ад 23 мая).

Апрача членаў камісіі запрашаюцца прадстаўнікі зацікаўленых ЖБКТ, аб'яднаньня будматар'ялаў, мэталязаводаў, камунальна-будаўнічай сэкцыі гарсавету, будсэкцыі ЦКК-РСІ, рэдакцый газэт і ўсе жадаючыя.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

8 чэрвеня, у 6 гадзін вечара, у памяшканьні клюбу ХАРЧАВІКОЎ адкрываецца

II-гі пашыраны пленум ЦС ОАХ БССР.

Парадак дня:
1) Задачы т-ва ОАХ БССР у сувязі з рашэньнем ЦК КП(б)Б і III пленуму ЦС ОАХ Саюзу. Дакладчыкі т. т. **ГАЛАДЗЕД і ДРЫЛЕНАН.**
2) Рознае.

Нам. старшыні ЦС ОАХ БССР **ДРЫЛЕНАН.**

8 чэрвеня, у 7 гадз. веч., у клюбе Гарсавету (плац Волі, 3-ці паверх) склікаецца **агульна-гарадзкая нарада камісій садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе** з парадкам дня—
аб мабілізацыі сродкаў насельніцтва і рэалізацыі дзяржпазык.
Пад адказнасьць старшынь фабзаўмясцкомаў прапануецца забясьпечыць яўку камсоставу у поўным складзе.

Гарпрафсавет.
Гарвыканкам.

Чырв. Зорка Пач. 6, 7-30, 9, 10-30 Каса—ад 4 г.	Новы савецкі прыгодніцкі фільм **БАМБІСТ** рэвалюц. эпапэя ў 6 частках.
Інтэрнацыянал	Амэрыканскі мастацкі фільм **МАУЧАЦЬ** (Бязбожніца) Зьвыш прагр. Кіно-хроніка
ПРАЛЕТАРЫ	Осі Асвальд у камэдыі **Гэта мой жаніх** у 7 частках
СПАРТАК Пач. 7-15, 9, 10-45 Каса—ад 5 г.	МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **КРУГ** Драма ў 7 частках.

Белдзяржлугтрэсту ПАТРЭБНЫ:
3 грузавыя аўтамабілі грузападзёмнасьцю ад 1,5 да 2,5 тон,
1 лёгкавы і 2 матацыклі.
Можна з невялікім рамонтам.
З прапановамі зьвяртацца —Савецкая вул., 57 тэл. 7-03.

АБ'ЯДНАНЬНЕ ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ
БЕЛКААПСАЮЗУ
ПРЫМАЕ ПА ОРДЭРАХ ЗРК
індывідуальныя заказы
на пашыўку гатовага адзеньня
ў наступных пунктах:
Менск, крама № 1, Ленінская, 11.
Віцебск, крама № 8, Вакзальная, 28.
Гомель, крама № 11, Савецкая, 14.
Магілеў, крама № 10, вуліца 1-е мая, 31.
Бабруйск, крама № 12, Сацыялістычная, 110.
Заказы з матар'ялаў заказчыкаў прымаюцца бяз ордэраў.
АБ'ЯДНАНЬНЕ ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ БЕЛКААПСАЮЗУ.

Сэктар завочнага навучаньня пэдагагічнага рабфаку БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ абвяшчае, што пры ім —) АРГАНІЗАВАНЫ (—
КАНСУЛЬТАЦЫЙНЫ ПУНКТ ЗАВОЧНІКА.
Кансультацыі завочнікаў падрабфакаў праводзяцца што дзенна ад 6 да 8 гадз. веч.

ЧЫРВОНА-БЯРЭСКІ
Бульбатэхналёгічны тэхнікум
абвяшчае набор студэнтаў на 1-шы курс асеньняга прыёму ў ліку 90 асобо на агранамічнае, крухмальнае і броварнае аддзяленьні.
Усе студэнты забясьпечваюцца інтэрнатамі, а стыпэндыямі—75 проц.
Заявы прымаюцца з 5-VI да 15-VIII—32 г. Да заяў далучаюцца дакументы ў арыгіналах, якія перадічаны ў правілах прыёму на 1932 г.
Заявы накіроўваюцца па адрасе: ст. Чырвоны Бераг, Жлобінскага раёну, прыймовай камісіі пры тэхнікуме.
Дырэкцыя.

Веснавы прыём
ў завочны камуністычны унівэрсытэт і завочны камсамольскі унівэрсытэт спынен з 5 чэрвеня 1932 г.
ПРЫЁМ на радыё-курсы ПАРТАКТЫВУ ПРАЦЯГВАЕЦЦА
Загадчык ЗКС Любін.

Рабфак Беларускага плянава-эканамічнага камбінату
АБВЯШЧАЕ АСКНЬНІ ПРЫЕМ:
На 3-ці курс дзеннага рабфаку — 90 чал., на 3-ці і 4-ы курс вяч. рабфаку—120 чал.
Прыём заяў з 10-VI да 15-VIII у памяшканьні камбінату.
Правілы прыёму, згодна даведніку НКА.
Адрас камбінату: гор. Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой 209.
Дырэкцыя плянава-эканамічнага вучэбнага камбінату.

ВЫДАВЕЦТВУ „ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБНЫ
ВОПЫТНЫ
старшы бухгальтар і віраўнік справ.
Зварачацца: Савецкая, 63, 2-гі паверх.

ПЛЯНАВА-ЭКАНАМІЧНЫ
вучэбны камбінат
абвяшчае
асеньні набор у плянава-эканамічны тэхнікум—90 чал. на с. г. аддзяленьне, 90 чал.—на прамысловае аддзяленьне, з якіх 30 чал. без адрыву ад вытворчасьці.
Правілы прыёму, згодна даведніку НКА.
Тэхнікум рыхтуе плянавіноў-эканамістаў для плянавай сыстэмы Дзяржпляну БССР і гаспадарчых арганізацый.
Тэрмін навучаньня—3 гады.
Інтэрнатам забясьпечваюцца ўсе студэнты, стыпэндый 60 проц.
Заявы і дакументы накіроўваць па адрасе: Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, галоўны корпус, плянава-эканамічны вучэбны камбінат, пакой 209.
Дырэкцыя плянава-эканамічнага вучэбнага камбінату.

Для Беларускай Акадэміі Навук
ПАТРЭБНЫ
машыністкі, якія добра ведаюць беларускую мову, і практыкантыі-машыністкі з адукацыяй ня ніжэй сямігодкі.

Беларускаму бульбяному інстытуту і бульбяной доследчай станцыі ў Вялікай Сьляпянцы
ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА
Зарплата па згодзе з камунальным абслугоўваньнем.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА
„ЗАГОТЖЫВЁЛА"
ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ
з Савецкай вул. № 46, на НЯМІГУ 9.
Тэл. наступныя: габінэт кіраўніка — 7-70.
група кантрактацыі — 13-15.
і сакратарыят — 10-85.
2—сэктар
„БЕЛЗАГОТЖЫВЁЛА".

6 чэрвеня АДКРЫВАЕЦЦА
ВЫСТАЎКА
канчатковага архітэктурнага праекту і макету будынку Беларускага Дзяржаўнага Тэатру.
Выстаўка адкрыта за 15 да 19 гадзін штодзенна ў фае тэатру.
УВАХОД ВОЛЬНЫ.
Арганізаваныя экскурсіі па папярэдняй дагаворнасьці з дырэкцыяй тэатру (па тэлефону № 2-07) даюцца тлумачыльні аўтарам праекту архітэктарам Г. Л. Лаўровым.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ
кармовых культур і аграхэміі
(у Горках) абвяшчае асеньні прыём студэнтаў на першы курс інстытуту на наступныя аддзяленьні: 1) насеннаводнае, 2) кормаздабываньня для буйнай рагатай жывёлы, 3) кормаздабываньня для дробнай жывёлы і 4) аграхімічнае.
Заявы з дакументамі, згодна правіл прыёму (заваная анкета з яскравым адказам на ўсе пункты, аб'ектыўны, вайсковай павіннасьці, узросьце, здароўі і 2 фотакарткі і г. д.)—прымаюцца да першага верасьня. Іспыты для асоб, якія ня маюць адпаведнай адукацыі, адбудуцца з 25-га верасьня па 1-е кастрычніка.
Заняткі пачнуцца з 1 га кастрычніка 1932 году.
Заявы з дакументамі і паштовымі маркамі на 30 кап. дасылаць па адрасе: гор. Горкі, БССР, Інстытут кармовых культур і аграхэміі.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Віцебскі вучэбны
ВЭТКАМБІНАТ
—) АДКРЫВАЕ (—
4-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы да асеньняга набору ў вэтінстытут.
Заявы і дакументы прымаюцца ў канцылярыі вэтрабфаку з 9 да 3 гадз. дня і з 6 да 9 гадз. веч., за выключэньнем выхадных дзён 0,5 (г. Віцебск, Валадарская, 58/15
На курсы прымаюцца з адукацыяй ня менш 6-7 груп сямігодкі.
Пачатак заняткаў 15 чэрвеня г. г.
Залічаныя на курсы ва бясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
ВЭТКАМБІНАТ.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ
па падрыхтоўцы рахункавых кадраў бел. к-ры «Союзоргучет»
абвяшчае набор слухачоў
у 6-ці месячную групу бухгальтараў
для сыстэмы Белільнатрэсту.
На курсы прымаюцца асобы з рахункавым стажам ня ніжэй аднаго году і з адукацыяй ня ніжэй пяці груп.
Стыпэндыя 100 руб. у м-ц.
Інтэрнатам слухачы не забясьпечваюцца.
Слухачы прымаюцца да сталоўні.
Пасьля сканчэньня курсаў слухачы павінны працаваць ня менш 2-х год на раёне на прадпрыемствах Белільнатрэсту.
Заявы з дакументамі: 1) аб сэкц. становішчы, 2) аб адукацыі, 3) аб узросьце, 4) аб працоўным стажы, а калгасьнікі дадаткова згоду свайго праўленьня.—падрэбна накіраваць па адрасе: Менск, Міхайлаўская вуліца, 1/4, 3 школа, курсы „Союзоргучет".
Заявы прымаюцца да 15-га чэрвеня.
Навучальны камбінат „Союзоргучет".

Чаго варты „мірныя" запэўненьні японскіх імпэрыялістаў

Толькі ўчора ў савецкай прэсе надрукавана праграмная прамова японскага прэм'ера Саіто ў парляманце, дзе ён пацьвярджае мірныя намеры Японіі ў адносінах да СССР і дзе заяўляе, што «сапраўдны мэтай перасоўваньня японскіх войск на поўнач Манчжурыі зьяўляецца абарона жыцьця і маемасьці японскіх рэзыдэнтаў». З такімі мірнымі заявамі ў апошнія часы выступалі ўжо і іншыя палітычныя дзеячы Японіі.

Японскаму імпэрыялізму пасьля шанхайскага ўроку, а таксама з **прычыны ўзмацненьня рэвалюцыйнага руху ўнутры краіны** і ўлічваючы эканамічную магутнасьць Савецкага Саюзу прыходзіцца перабудоўваць свае рады і яшчэ больш грунтоўна рыхтавацца да ажыцьцяўленьня сваіх імпэрыялістычных плянаў у адносінах да СССР. Гэтым і тлумачацца ўсе падобнага роду «мірныя заявы». Што гэта так, дык найвыразьней за ўсё сьведчыць выступленьне пару дзён таму назад японскай газэты «Нічоні», якая вуснамі свайго журналіста Камаіці, а **фактычна вуснамі японскай ваеншчыны адкрыта заявіла, што Японіі патрэбна Усходняя Сібір, Прымор'е.**

Таксама адкрыта выбрэхвае сакрэтныя пляны японскага імпэрыялізму і прэса польскага імпэрыялізму, які ня можа дачакацца сыгналу ад свайго ўсходняга саюзьніка для ўзброенага паходу на СССР. Пераклічка паміж японскімі і польскімі інтэрвэнтамі адбываецца ўвесь час. У той час, калі афіцыяльныя прадстаўнікі Японіі выступаюць з заявамі аб мірных намерах у адносінах да СССР, аб тым, што яны зусім **ня маюць намеру акупаваць Манчжурыю,** а толькі «абараняць інтарэсы сваіх рэзыдэнтаў», у **«Кур'еры Віленскім»** (орган віленскіх пілсудчыкаў) у № 125 ад 4 мая зьяўляецца інспіраваная японскім генштабам карэспандэнцыя з Харбіну, дзе чорным на белым напісана наступнае:

***

«На працягу апошніх тыдняў паўныя акапічнасьці прымусілі японцаў весьці адкрыта палітыку ў справе Манчжурыі. Нават тая малая доза «самадзейнасьці», якую атрымалі кітайцы на кіруючых пасадах у афіцыяльных органах і адміністрацыі Манчжурскай дзяржавы, паказалася для японскага вайсковага кіраўніцтва занадта небясьпечнай. Зараз усе гэтыя ўстановы энэргічна і станоўча японізуюцца.

Прычынаю гэтага кроку была «здрада» генэрала Ма. Генэрал — гэты кітайскі палітык старога тыпу — праводзіў складаную, дасканала абдуманую тактычную гульню. Спачатку змагаўся супроць японцаў на чале цыцыкарскіх кітайскіх войск, потым «пагадзіўся» з ворагам і быў прызначан вайсковым міністрам ва ўрадзе новай Манчжурскай дзяржавы. Як член ураду, ён думаў, што ўдасца яму арганізаваць незалежную манчжурскую армію і пры дапамозе тактычных і палітычных манэўраў удасца яму дабіцца незалежнасьці Манчжурскай дзяржавы. Зразумела, што яго першыя крокі ў гэтым напрамку сустрэлі адпор з боку японцаў, якія давалі высокім кітайскім чыноўнікам асаблівыя карысьці, але не дазвалялі, каб яны дасягнулі палітычнай магутнасьці, або сталі на чале ўраду. Кітайскі генэрал, пераканаўшыся ў бязвыніковасьці намаганьняў у гэтым напрамку, вырашыў пачаць адкрытую барацьбу. Выехаў у Сахалян над Амурам, які да гэтага часу неакупаваны японскімі войскамі і адтуль рассылае па ўсім сьвеце гарачыя адозвы ад імя кітайскага народу, у якіх выкрывае сутмі. Японскія войскі, праўда, могуць прымусіць партызанаў адступаць, але ня могуць іх зьнішчыць, бо апошнія знаходзяць сабе дасканалыя сховы ў лясох і стэпах. Сёньня ўжо выразна відаць, што Японія прымушана будзе выслаць у Манчжурыю вялізарную колькасьць войск, каб замацаваць сваю акупацыю.

У апошнія часы японска-савецкія адносіны значна абвастрыліся, на гледзячы на ўсе запэўненьні аб адваротным стане рэчаў. Прычынаю гэтага абвастрэньня адносін зьяўляюцца новыя сутычкі ў раёне Харбіну, спроба ўзарваць мост на Сунгары і арышты савецкіх грамадзян у Харбіне. З знадворнага выгляду ў апошнія часы здаецца, што наступіў пэўны пералом і напружаньне ў савецка-японскіх адносінах нямнога зьменшылася. Прычынаю гэтаму зьяўляецца тое, што ў Токіё добра разумеюць, што канфлікт з СССР у той момант, калі Манчжурыя яшчэ не «пацыфікавана» і аказвае рашучы адпор японскаму ўраду, быў